Цана асобнага нумару 20 гр.

Opłata pocztową uiszczono ryczałtem.

ПРАВА ПРАЦЫ

Выходзіць два разы у тыдзень.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12—6 (Wileńska 12. m. 6) Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 вядз. штодня, апрача сьвяточных дзён. Адміністр. ад 9 да 3.	Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 1 зл. 50 гр. Для заграніцы ўдвая даражэй. Перамена адрэсу 30 гр.	Непрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата падрукаван. залежыць ад Рэдакцыі.	Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 гр. за радок пэтыту ў 1 шпальту

№ 6 — Вільня, Субота 24-га сьнежня 1927 г. — Год I

У гэтым нумары 6 страніц.

Спэкуляцыя імем.

Выбары ў новы Сойм і Сэнат, перад якімі мы стаім, прывялі ў рух старыя, ужо заржавелыя, машыны збанкрутаваных павадыроў партыяў на абшарах Заходняй Беларусі, і выклікалі да жыцьця цэлы рад новых палітычных партыяў, груп, угрупаваньняў, „Zjednoczeń“ і г. д. і г. д. І каго тут няма і старое, збанкрутанае Вызваленьне і ППС і Партыя Працы і Умястоўскі, і іншыя „краёўцы“, і Паўлюкевічаўцы і Эсэры і падобныя ім прапойцы; і манархісты, і дэмакраты, і эндэкі, і хадэкі, урэшце вядомыя здраднікі беларускіх працоўных гушчаў — сельсаюзьнікі фірмы Ярэміча і Рагулі, каталіцкія беларускія хадэкі кс. Станкевіча ды зноў-жа новасьпечаная група праваслаўнай хадэцыі з вядомым маскалём — б. сэнатарам Багдановічам на чале. Гэты сьпіс старых і новых партыяў далёка ня ўвесь, яго можна прадоўжыць яшчэ далей, але і гэтага даволі, каб паказаць, якая хмара хціўцаў на мандаты насоўваецца на беларускія працоўныя гушчы, каб затапіць іх „добрадатным“ дажджом абяцанак, прыгожых слоў, слоў „любові і адданасьці гэтым гушчам“.

Усе гэтыя старыя і новасьпечаныя групы ўжо напусьцілі на беларускія працоўныя гушчы мірыяды агентаў, якія суляць на іх пагляд дурненькім сялянам — залатыя горы ды малочныя рэкі з кісельнымі берагамі.

Але, поруч з галасамі аб дабрадзействе саміх сябе, гэтыя групы ўсьцяж дазваляюць сабе яшчэ нешта іншае. З усіх куткоў Зах. Беларусі даходзяць да нас чуткі, што ў сваей, прадсьмяротнай бязумоўна агоніі — гэтыя групы *карыстаюцца нашым імем*, каб абдурыць працоўныя гушчы на сваю карысьць. Яны гавораць, што група, выразіцелем якой зьяўляецца газэта „Права Працы“, нібы прадбачачы свой лёс на выбарах, *заранеі зраклася думкі правядзеньня сваіх кандыдатаў* у наступны Сойм і Сэнат і што беларускія працоўныя гушчы, па тых ці іншых меркаваньнях — запрашаюцца галасаваць за іх, за тых, хто гэта гаворыць, як за групу ў тым ці іншым адношаньні стаячую у беспасярэдняй сувязі з ідэалёгіяй нашай газэты.

Іншыя проста страшаць беларускія працоўныя гушчы, што ім пагражае небясьпека быць арыштаванымі, калі яны будуць дзяржацца свае спробаванае абароньніцы, пагражае ўрэшце небясьпека астацца наагул без сваіх прадстаўнікоў у Законадаўчых палатах, прапануючы, бязумоўна, выбраць іх на гэтых прадстаўнікоў.

Гэтая яўная хлусьня, як і падобныя іншыя зьявішчы спэкуляцыі імем нашай газэты, з мэтай ашукаць лёгкаверных на іх пагляд выбаршчыкаў — мусіць быць раскрыта і нашы карэспандэнты павінны аб усіх праявах гэтага пісаць у рэдакцыю, як таксама і аб спосабе змаганьня на мясцох саміх працоўных гушчаў з гэтай проста крымінальнай працай ласых на мандаты круцялёў. Ніколі наша газэта не сказала нічога падобнага, што ёй у даным выпадку прыпісваюць. Так—наша газэта ніколі ня лічыла і ня лічыць, што выбары ў Сойм ёсьць адзіным і найлепшым спосабам ратунку працоўных масаў ад усіх злыдняў, якія іх душаць. Газэта лічыць, што ратунак гэты можа даць толькі штодзённая, упартая барацьба з сваімі эксплёататарамі і здраднікамі за свае правы, за свае інтарэсы. Выбары ў Сойм газэта лічыць толькі адзінаю праяваю сацыяльнай і нацыянальнай сьведамасьці працоўных гушчаў, а самы Сойм — толькі пляцоўкай, трыбунай, важнай для ўсьведамленьня і мабілізацыі гушчаў для барацьбы за сваё вызваленьне. Газэта стала цьвердзіць, што з новымі выбарамі яшчэ ня ўсё будзе заваёвана, выбары толькі дадуць магчымасьць працоўным гушчам змагацца і тым спосабам, якім змагаюцца з імі іхныя ворагі. *Не аб мандатах ходзіць, а аб новай барацьбе.*

Але гэта ня значыць, што наша газэта з лёгкім сэрцам адходзіць ад выбарнай акцыі, уступаючы месца яўным ворагам працоўных гушчаў. Наш абавязак тлумачыць іхняе запраўднае аблічча, іх падшываньне ў авечыя скуры, іх шкадлівую папярэднюю працу, шкадлівую для тых, абаронцамі якіх на час выбараў яны сябе выстаўляюць.

Пры той лучнасьці газэты з беларускімі працоўнымі гушчамі, у існаваньні якой ня могуць адмовіць нам нават найзьлейшыя нашыя ворагі, пры нашай поўнай веры і перакананьні ў сьвядомасьць і творчы сацыяльны інстынкт беларускіх працоўных гушчаў—мы не сумляваемся, што гэтыя гушчы і самі добра разумеюць, што робіцца, не дадуць ашукаць сябе манлівымі клічамі і пойдуць з тымі, хто стала, а ня толькі на час выбараў, бароніць іхнія інтарэсы і ня толькі іхнія, а і ўсіх працоўных масаў Польшчы. Цесная лучнасьць беларускіх працоўных гушчаў з працоўнымі гушчамі іншых нацыянальнасьцяў рэспублікі, цесная лучнасьць з сваею газэтаю ды з сваімі выпрабаванымі вядомымі абаронцамі—вось залог перамогі беларускіх працоўных гушчаў, вось той шлях, з якога ня мусяць яны зблудзіць і які іх і пры выбарах і на выбарах прывядзе да перамогі.

Да ведама сяброў Т-ва Белар. Школы.

28—29 XII 1927 г. адбудзецца Агульны Зьезд сяброў Т-ва Бел. Школы ў Вільні, у памяшчэньні Народнага Дому пры вуліцы Сьв. Ганны 2—3. Пачатак зьезду ад 11 гадзіны дня 28-XII.

Сябры, прыежджыя з правінцыі павінны захапіць з сабой сяброўскія білеты і пасьведчаньні ад гурткоў або Акружнае Управы.

Галоўная Управа Т-ва Бел. Школы.

Два асяродкі выбуховага фашызму у Эўропе—Балканскі і Балтыцкі.

Навакол польска-літоўскага канфлікту сканцэнтравалася няменш дыплёматычнай увагі і ваеннай трывогі эўрапэйскай апініі, як навакол—усьцяж пагражаючага вайной спору Італіі з Югаславіяй з-за Альбаніі.

Запраўды-ж—абедзьве невялічкія дзяржаўкі, навакол якіх сканцэнтравалася столькі выбуховых сілаў канкуруючых у сваіх захватных імкненьнях эўрапэйскага „фашызмаў“ — вельмі падобныя адна да аднэй — ня толькі па свайму ўнутранаму палітычнаму ладу, перадусім—па свайму міжнародна-палітычнаму палажэньню. Як Альбанія таксама і Літва—вельмі адсталыя культурна, а дзеяя таго—бедныя краі, дзе народ, пераважна—сялянства, не прадстаўляе арганізаванай палітычнай сілы, якая можа спакойна і стала дыктаваць праз трывалыя дзяржаўныя ўстановы сваю волю ўраду. — Канкуруючыя навакол гэтых малых дзяржаваў магутныя дзяржавы азначылі ўнутры — палітычную барацьбу партыяў у краі ў значнай меры, як „барацьбы ўплываў“ ці „арыентацыяў“. А гэта—ўканцы—дало магчымасьць якраз можа найслабейшай, але найбольш спрытна „паразумеўшайся“ з сваей пратэкторкай групе захапіць—шляхом ваеннага перавароту—ўладу ў краі... А гэта, зразумела, яшчэ больш распалівае гнеў і апэтыты канкурэнтаў...

Як Альбанія, таксама і Літва, падзялілі эўрапэйскія дзяржавы на два варожыя ваенна-дыплёматычныя лягэры, паміж якімі дыплёматычная канкурэнцыя можа ў кожны мамэнт перайсьці ў ваенны канфлікт. Кожная з заінтэрэсаваных дзяржаваў пільна сачыць за тым, каб—ані Літва, ані Альбанія, якімі малымі яны ня есьць—ня была далучана—ў тэй ці іншай, яўнай ці замаскаванай форме—да яе канкурэнта... Бо-ж гэта—адразу зьмяніла-б той стан „раўнавагі сілаў“, які створаны быццам Вэрсальскім Трактатам, дый які лічыцца „нармальным“ у Эўропе...

А гэта даводзіць, што абедзьве малыя ды слабыя дзяржаўкі маюць вялізарнай важнасьці геаграфічнае палажэньне ў Эўропе, асабліва цікаўнае для беспасрэдных суседзяў абедзьвюх. Альбанія зьяўляецца для Італіі мастом на Балканы — перакінутым праз Адрыятыцкае мора, мастом па якому, пойдзе ўжо лёгка „Італьянская экспансія“ (пашырэньне ўплываў — гаспадарчых дыплёматычных і... ваенных) — на ўсе Балканы. Побач з тым, маючы замацаваньнымі абодва канцы мосту дый яшчэ — у самага выхаду з Адрыятыцкага мора — Італія запраўды зьдзяйсьняе адзін з найбольш баявых лёзунгаў сваей захватнай замежнай — палітычнай праграмы: робіць гэтае Адрыятыцкае мора сваім унутраным морам, — „нашым морам“, як яго называе ўжо цяпер (!) італьянскі фашызм... Якое значэньне мае гэта для разьвіцьця італьянскага ваеннага флёту, для ўплыву яго ў Сяродземным моры, асабліва ў часе вайны, ясна кожнаму.

Але гэткія імкненьні ды пасьпехі Італіі ў Альбаніі, якія фактычна аддаюць Італіі, як сказана, усе заходняе ўзьбярэжжа балканскага паўвострава з значнай апорнай тэрыторыяй (так званым „гінтэрляндам“) на самым паўвостраве, зьяўляюцца страшэннай нагрозай для самастойнасьці, а з часам і — незалежнасьці другіх балканскіх дзяржаваў, сярод якіх няма аніводнай, якая-б раўнялася з Італіяй сіламі... Дык дзіва, што наймагутнейшая з балканскіх дзяржаваў—Югаславія, якая хоча быць сама камандзірам на Балканах, гатова на вайну, каб толькі спыніць „італьянскую экспансыю“ на Балканах, а перадусім—выбіць Італію з яе альбанскай пазіцыі... Італія ясна і з уласьцівым адкрытым фашызму цынізмам заяўляе, што „Балканы—натуральны абшар для пашырэньня „ўплыву“ Італіі.—Дык усялякія спробы „Грэбляваньня“, спыненьня гэтых „натуральна“ пашыраючыхся „ўплываў“ яна будзе разглядаць, як праяву варожасьці да яе, як—правакаваньне вайны з ёй... Зачэпны, правакацыйны характар такога становішча ясна кідаецца ў вочы...

Югаславія высоўвае хутчэй абаронны лёзунг—быццам агульна-балканскі:

„Балканы — для балканскіх народаў“, лічучы італьянцаў—чужынцамі-захватчыкамі.

Як ведама, за плячыма Югаславіі і Італіі стаяць яшчэ больш магутныя канкурэнты, яшчэ вялікшыя дзяржавы — Францыя і Англія, якія — у разе ваеннага канфлікту між Італіяй і Югаславіяй—таксама не астануцца бяздзейнымі... Францыя даказала гэта ўжо бясспрэчна, заключыўшы толькі што „саюз ваеннай прыязьні“ з Югаславіяй.

У адказ на гэта Італія яшчэ цясьней зацiснула ваенна-палітычныя вязі, лучачыя яе з Альбаніяй, асабліва ярка падчыркнуўшы ў апублікаваным толькі што дэманстрацыйна новым трактаце — якраз яго ваенныя мэты... Гэта выклікала нездаволеньне нават у „дазволіўшай“ Мусоліні „пашырацца на Балканах“—Англіі...

Захват Альбаніі Італіяй на нашых вачох зрабіўся ўжо амаль ня фактам дакананым...

Цяпер—перад магчымым ў кожны мамэнт ваенным выбухам—пачне канцэнтравацца навакол гэтага асяродку ў Эўропе — далейшае награмаджэньне ваенна выбуховых матэрыялаў... Эўропэйскія дзяржавы будуць групавацца ў саюзы, якія выясьняючы сабе паволі свае інтэрэсы ў падрыхтоўваючайся вайне, будуць падзяляцца на два варожыя лягеры, паміж якімі створыцца так званая „раўнавага“—знамянітая „эўрапэйская раўнавага“, якая—заўсёды ў канцы няўхільна даводзіла і давядзе да вайны...

Амаль ня тое-ж самае — точка ў точку — робіцца і навакол Літвы.

Літва мае вялізарнае гаспадарчае і стратэгічнае значэньне для абедзьвюх гаспадарча і палітычна канкуруючых дзяржаваў, якіх апрача таго, Вэрсальскі трактат і ўся палітыка саюзьнікаў—пераможцаў умысна зрабіла сьмяротнымі ворагамі: Нямеччыны і Польшчы. Апрача таго, Літва мае ня меншае значэньне і для трэйцяга свайго суседа, які зьвязаны цэлым радам трактатаў і інтарэсаў з Нямеччынай: для ССРР. Для Нямеччыны і ССРР Літва зьяўляецца найкарацейшым паўночным мастом для ўсялякага роду ўзаемнай камунікацыі — незалежнага ад транзытнага шляху праз Польшчу. Апрача таго, Літва для Нямеччыны мае значэньне, як заслона ды забясьпечаньне, процi „акружэньня“ з польскага боку яе ўсходня-прускіх зямель, якія Вэрсальскім нажом адрэзаны ад Нямеччыны ды аддзелены так званым „польскім калідорарам“... Ня кажам ужо аб чыста гаспадарчым значэньні Літвы для Нямеччыны, як пакорнага ей рынку для нямецкага ўвозу і вывазу.

Для Польшчы Літва, паміма рамантычных „ягелёнскіх традыцыяў“, мае аграмаднае значэньне, таксама — як заслона ад нападу з боку Нямеччыны. Апрача таго, Літва трымае ў сваіх руках увесь водны шлях Немна—гэтую важную вывазную артэрыю краю. Бо ж Клайпэдзкім портам („порт“ палаціне і значыць брама) запірае ўвесь гэты шлях, спыняючы на ім усялякі рух...

Але тут пачынаецца розьніцца паміж нямецка-італьянскім і польска-літоўскім стасункамі. Тады як Нямеччына наагул давярае Літве, з якой патрапіла ўстанавіць добрыя наагул адносіны, таксама, як і ССРР, Польшча—наадварот — страшэнна папсавала свае адносіны з Літвой, дык не давярае ані воднаму яе ўраду, ачі воднай ўрадавай яе партыі. Ці трэба дадаваць што ўсе літоўскія ўрады, якія толькі існавалі дагэтуль, плацяць Польшчы — тым-жа абсалютным недаверыем... З гэтай прынцыповай розьніцы вынлывае і розьніца польскай і нямецкай палітыкі адносна да Літвы. Нямеччына і ССРР, давяраючы Літве, заінтэрэсаваны ў тым, каб яна іставала, як зусім самастойная, незалежная дзяржава, самым фактам свайго незалежна дзяржаўнага існаваньня зьўляючыся ўжо ня толькі карысным, але і неабходным для іх—заслонам процi Польшчы ды мастом, незалежным ад Польшчы. Польшча наадварот: недазяраючы Літве, „заінтэрэсавана ня столькі ў літоўскай дзяржаве, сколькі—у літоўскай тэрыторыі, як трафна піша „Biel. Kгупіса“.

Як бачым, і ў „балтыцкім асяродку“ згуртавана няменш выбуховых матар'ялаў, якія далей гуртуюцца ўсьцяж, групуючы навакол сябе ды падзяляючы на два варожыя „абозы“ дзяржавы,—рыхтуючы і тут — ваенную навальніцу..

Як «сільна» пішуць перадвыбарныя стацьці — „сялянскія павадыры“.

Ведамы павадыр польскага „Сялянскага Саюзу“ п. Домбскі, які ў свой час поруч з Вызваленьнем праваліваў зямельную рэформу ў Сойме, а пасьля — падтрымліваў „зямельную палітыку“ павадыра польскіх абшарнікаў мін. Незабытоўскага, а—ад маёвага перавароту дый да апошняга дня існаваньня Сойму—прадстаўляў у ім „урадавую большасьць“—побач з „Клюбам Працы“ віцэ-прэм. Бартля,—цяпер, у часе выбарнага паляваньня на мандаты, вось як радыкальна пачаў пісаць у сваей „Халопскай Газэце“.

„Сяляне цяпер—выбарнай барацьбой — або сарвуць з сябе рэштKi кайданаў, або — кайданы гэты будуць наложаны ім на абедзьве рукі і ногі дый яшчэ — з маленькім ланцужком на шыю...

Шляхта, капіталісты ды ксяндзы даскапала разумеюць, аб што ідзе ігра... Першыя кінуліся ў бой—кардыналы, арцыбіскупы ды біскупы, выдаўшы ў самы дзень назначэньня выбараў—выбарную адозву — пад відам „Пастэрскага Пісьма“, ад якога будуць цяпер аж трасьціся ўсе касьцёльныя амбоны ў Польшчы...

Архіпастыры, замест таго, каб пільнавацца свайго касьцёла ды трымаць у жалезных рукавіцах сваіх ксяндзоў, каб яны ня зьдзіралі апошняй скуры з сваіх парахвіянаў, дый ня горшылі тых парахвіянаў сваім абжорствам, кардзяжом ды распустай, заклікаюць да стварэньня новай выбарнай „Усэмкі“ (слаўнай „Хіены“ першых выбараў)—„каталіцкай ды народовай“, „богоойчызьнянай“,

ці—да такога-ж самага ашуканства, якое мы бачылі ўва ўсім яго „маестаце“ (велічы) ў часе выбараў 1922 г...

І далей:

„Ведаем мы, што навакол гэтых „мільёвых сутанаў“ і іншых пастаралаў, ды навакол усей гэтай ніжэйшай чорнай жандармэрыі згуртуецца ўсё, што толькі есьць у краі рэакцыйнага ды жываедзкага. — Усё, толькі што жыве чужой працай, усё, што добра есьць, добра адзяваецца, п'е ды жчве ў добрых кватэрах, усе, што добра „зарабляе“, не — ў месьце ці на вёсцы — усё гэта згуртуецца навакол гэтых „фіолетаў“ (біскупаў), пасторалаў ды чорных „рэвэрэндаў, (ксяндзоў)—пойдуць з імі—абшарнікі, перастрашаныя марай зямельнай рэформы, пойдуць фабрыканты, гандляры, спэкулянты і падобныя да іх эксплёатары чужой працы—бо-ж яны самі ня маюць ніякіх аргумэнтаў для абароны свайго вызыску працоўнага насяленьня. Дык для іх ксяндзы дык тыя ўжо заўсёды знойдуць нешта ў сьвятым пісаньні на іх абарону, і тыя мейсцы ў ім, якія — па думцы пісаньня — мелі біць па твары гэтых багатых эксплёататараў, ксяндзы перакруцяць, як за-звычай, — проці бедных ахвяраў вызыску, а перадусім—проці сялян і работнікаў“...

Знайшліся ж такі—і ў „шчырага пілсудчыка“ ды сябра міністру Незабытоўскага ды Бартля, п. Домбскага сільныя словы... ў часе выбарнага паляваньня... за душамі ды перадусім—галасамі сялянаў і работнікаў...

А вось—чаму-ж гэта навет пэпэсы ды вызваленцы адмовіліся блёкавацца — на выбарах з гэтым „Сялянскім Зьвязком“ п. Домбскага?!

Цікаўна нашаму селяніну і работніку ведаць запраўдны характар гэтага польскага „Сялянскага Саюзу“—з пагляду на нашы беларускія партыйныя „стасунэчкі“ ды звычаі. Бо-ж есьць і на нашых беларускіх выбарных абшарах—і тых шмат, аб кім піша Домбскі, і тых іх „павадыроў сялянства“, як гэты п. Домбскі, што так добра піша... — Пачытайце весь толькі—„Сялянскую Ніву“...

Чаму латвійскі урад падау у адстауку.

Афіцыёз апошняга латвійскага ўраду, падаўшага ў адстаўку, „Сацыял-дэмакрат“ падае прычыны, якія змусілі ўрад да адмовы ад улады.

Урадавая большасьць у парляманьце—ў выніку заключэньня трактату з Радамі, абурыўшага латвійскую (і... англійскую) буржуазію—зьменшылася так, што ўстрыманьне ці адсутнасьць 2—3 паслоў у часе галасаваньня ставіла урад у крытычнае палажэньне. Гэтае палажэньне ўраду, пэўне-ж, імкнуліся выкарыстаць розныя дробныя групы, уваходзячыя ў склад большасьці ў Сойме, папросту часам шантажуючы яго сваімі дамаганьнямі ды пагрозамі—галасаваць проці... Апошні ўдар задалі ўраду расейскія паслы, якія, атрымаўшы адмову на свае дамаганьні, перайшлі ў апазіцыю. У выніку гэтага ўрадавая коаліцыя страціла большасьць у Сойме і—ўрад павінен быў зляжыць уладу...

Але-ж гэта — толькі вонкавы выгляд, тэхнічная прычына новага ўрадавага крызісу ў Латвіі. Калі мы бліжэй прыглядзімся да ўнутраных прычынаў крызісу, дый яшчэ шырэй аглядзім, што робіцца і ў іншых балтыцкіх дзяржавах у сучасны мамэнт, дык зразумеем лепш сутнасьць і значэньне латвійскага здарэньня, якое можа мець вельмі паважныя ды складаныя далейшыя вынікі. Бо-ж якраз — у тым-жа часе — адбываецца крызіс урадаў—у Эстоніі, Фінляндыі і—трэба спадзявацца нейкага павароту і ў фашыстаўскім ладзе ў Літве. І характэрна, што ўсюды зьмена ўрадаў ідзе ці мае іцьці ў кірунку права—нацыяналістычным, а перадусім—у кірунку проці—радавым... З гэтага відаць ясна, што ўрадавыя крызісы ды зьмены ўрадаў у радзе балтыцкіх дзяржаваў, аддзяляючых ССРР ад Балтыцкага мора, адбываюцца пад націскам буржуазіі, прытым—яе найбольш рэакцыйнай часткі, якая мае падтрыманьне, як ведама, з боку загранічнага капіталу, а перадусім—з боку рэакцыйнага ды асабліва варожага да радаў — англійскага ўраду... Мэта гэтага націску — добра ведама кожнаму. Англія мае намер—сьціснуць ды ізаляваць гаспадарча ССРР, перадусім адрэзваючы яго ад яго сувязі з Заходняй Эўропай. Як ведама, радава латвійскі трактат быў сольлю ў воку Чэмбэрлена — бо-ж якраз „рабіў шырокую браму“ ў муры, які меў пабудаваць Чэмбэрлен „ад мора да мора“—ў указаных вышэй мэтах. Гэты трактат, злучыўшы вялізарныя гаспадарчыя абшары ССРР з латвійскімі портамі, ажывіў увесь гаспадарча зьвязаны рэён паўночнага заходу ССРР, цягвучы да Балтыцкага мора. Усе гэта ня толькі падняла гаспадарчы рух у Латвіі, але і значна патаніла ў ей жыцьцё. Дык вось на гэта якраз абурылася латвійская буржуазія, якой, як і кожнай іншай, таннае жыцьцё для шырокіх масаў спажыўца—„адбірае хлеб“... Дык тут якраз латвійская буржуазія ізноў зьнюхался з англійскай агентурай у Латвіі, якая, маючы да дыспазіцыі вялізарныя грошы, пачала „намаўляць“ паслоў у Сойме, каб скідалі сацыялістычны, „прадаўшыся камуністам“ урад Сукеніека-Зэленска.

Трэба спадзявацца, што на якісь час буржуазія ў Латвіі ізноў захопіць ўладу, а тады—пэўне-ж спрабуе—скасаваць тракатт з Радамі, на што мае магчымасьці, бо першы год яго сілы лічыцца „спробнымі“.

Манархісты-абшарнікі хочуць зававяваць „крэсы“ пры выбарах.

Як ведама, манархісты-абшарнікі ўвесь час цьвердзяць, што абвешчаньне выбараў зьяўляецца памылкай Пілсудскага і яго ўраду. Такім чынам да абвешчаньня выбараў яны адносяцца нэгатыўна. За тое да самых выбараў яны адносяцца пазытыўна, робячыся такім чынам неконсэквэнтнымі, бо ў выбарах хочуць згуляць навет першую ролю. Сваю неконсэквэнтнасьць яны тлумачаць вось як: „Украінцы (галічане Рэд.) былі консэквэнтнымі, калі байкатавалі выбары, але-ж яны не хацелі належаць да Польшчы. (Тое самае можна сказаць і аб беларусах, калі яны байкатавалі віленскі Сойм Рэд.). Консэрватыст польскі ня можа ня быць „паньствоўцам. („Słowo“ 18/XII. г. г.)“. А дзеля гэтага, кажа тое-ж „Słowo“, на нарадзе „крэсавых“ кансэрватыстаў (манархістаў-абшарнікаў), якое адбываецца гэтымі днямі, мусяць быць прыняты пастуляты, згары ўжо выстаўленыя самымі рэальнымі абставінамі. Заключаюцца гэтыя пастуляты вось у чым:

1. „Імкненьне да ўтварэньня ў гэтых паветах („gdzie tak wielkie jest niebiezpieczeństwo Hromady i odrodzonej szesnastki“) аднаго польскага сьпіску, які-б прыцягнуў да сябе настроеныя леяльна да польскай дзяржавы групы нацыянальных меншасьцяў (калі ласка Паўлюкевіч і Умястоўскі заўсёды а votre disposition *) а можа-б і з шаснасткай можна было-б пагаварыць? Яна-ж таксама буржуазная! Рэд.)“.

2. „Імкненьне, каб на такіх агульна-польскіх сьпісках больш, бо прадстаўляюць яны огул дзяржаўна-настроеных грамадзян, як можна больш месца занялі прадстаўнікі грамадзкай правіцы („Słowo“ з 18. XII. с. г.)“.

Такім чынам з першага пастуляту відаць, што манархісты гатовы іцьці на выбары навет разам з „левымі“ польскімі партыямі, абы толькі пабіць ненавісную Грамаду, якая хоць і зьліквідавана, але, як страшная здань заўсёды наводзіць жах на польскіх крэсавых паноў. Як першы, так і другі пастулят зьяўляецца для нас зусім зразумелым, бо-ж ведама, што як правыя, і так званыя „левыя“ польскія партыі з роўнымі апэтытамі падыходзяць да беларусаў і гэта правізна ці так-званая „лявізна“ польская ў адносінах да крэсаў зусім аднолькавы.

Дык беларускія сяляне і работнікі мусяць сьцерагчыся няпрошаных апякуноў і гнаць іх мятлой ад сябе разам з іх крывадушнымі абяцанкамі, а тым болей мусяць гнаць так зв. леяльных з-ла Паўлюкевіч, Умястоўскі, бо яны на ўслугах польскіх паноў.

*) Да вашага загаду.

Палітычная хроніка.

У Польшчы.

Выбарны календар.

Згодна з загадам Прэзыдэнта Польскай Рэспублікі аб „выбарчай ордынацыі“ (парадак выбараў) у Сойм і Сэнат, усе акруговыя выбарчыя камісіі (назначаныя ўрадам) павінны былі 21 сьнежня выдаць абвешчаньні ў-ва ўсіх валасьцёх аб дні выбараў, аб гадзінах галасаваньня, а таксама аб лічбе паслоў, што могуць быць выбраны з данага вокругу.

Дня 27 сьнежня павінны быць закончаны сьпіскі асоб, маючых права галасаваньня.

2-га студзеня 1928 г. пачынаецца тэрмін спраўджэньня сьпіскаў выбаршчыкаў даных акругоў і будзе трываць да 15 студзеня ўключна.

З дня 24 студзеня 28 г. кончыцца тэрмін справаздачы ўрадовых (паньствовых) сьпіскаў кандыдатаў на паслоў і сэнатараў.

3 лютага 1928 г. Галоўны выбарчы камісар абвесьціць у „Dzienniku Urzędowym“ урадовыя (паньствовыя) сьпіскі кандыдатаў.

У гэты-ж дзень кончыцца тэрмін падачы сьпіскаў кандыдатаў на паслоў і сэнатараў па акругох (сьпіскаў неўрадовых).

У часе ад 9 да 13 лютага 28 г. адбудзецца паўторная справаздача сьпіскаў выбаршчыкаў.

Старшыні Акружных Выбарных Камісіяў.

Гэнеральны выбарны камісар вызначыў наступных старшынь акружных выбарных камісіяў.

№ 5 Беласток: старшыня Марцэль Барцярэлі віцэ-старшыня Акружнога Суда, заступнік Маразоўскі судзьдзя Акр. Суда.

№ 6 Горадня: старшыня—Камар судзьдзя Акр. Суда, заступнік — Рэйх міравы судзьдзя.

№ 56 Ковель: старшыня—Гроховскі міравы судзьдзя, заступнік—Рэмбішэўскі міравы судзьдзя.

№ 57 Луцк: старшыня — Бабкоўскі судзьдзя Акр. Суда, заступнік Клейнэрт сьледчы судзьдзя.

№ 58 Крэменец: старшыня—Токажэўскі-Касевіч мір. судзьдзя, заступнік—Лозінськi міравы. судзьдзя.

№ 59 Берасьць: старшыня — Залуске міравы судзьдзя, заступнік Дмоўскі міравы судзьдзя.

№ 60 Пінск: старшыня—Рэутт судзьдзя Акр. Суда, заступнік — Магуеўскі судзьдзя Акр. Суда.

№ 61 Навагрудак: старшыня—Парфяновіч судзьдзя Акр. Суда, заступнік — Маркевіч-Ёдко судзьдзя Акр. Суда.

№ 62 Ліда: старшыня — Левіч-Баранскі міравы судзьдзя, заступнік — Шчэнсновіч мір. судзьдзя.

№ 63 Вільня: старшыня — Дмовскі судзьдзя апэляц. суда заступнік — Вевцковіч.

№ 64 Сьвянцяны: старшыня — Ільляшэвіч мір. судзьдзя, заступнік — Кухэнскі мір. судзьдзя.

Як быў назначаны гэнеральны камісар па выбарах.

„Robotnik“ падае цікаўныя супастаўленьні ды разважаньні—аб тым, як быў назначаны гэнеральным камісарам віцэ міністар справядлівасьці п. Цар.

Паводле закону, гэнеральны выбарны камісар назначаецца п. Прэзыдэнтам Рэспублікі па прапазіцыі старшыні ўраду спаміж трох кандыдатаў, прадстаўленых старшынёй Найвышэйшага Суду.

Газэты падалі толькі прозьвішчы тых кандыдатаў, якіх прадставіў Навышэйшы Суд, але ў іх лічбе п. віцэ-міністра Цара ня было... Пасьля гэтага адно з прыватных польскіх агенстваў („Публіцыстычнае“), паведаміла, што паны „прэзэсы“ Найвышэйшага Суду... ізноў сабраліся, каб... прадставіць п. Прэзыдэнту другі сьпісак сваіх кандыдатаў, сярод якіх цяпер ужо аказаўся п. віцэміністар Цар...

Што-ж гэта значыць, калі лічыць, што вестка „Публіцыст. Агенства“ праўдзівая? — Гэта значыць, што сярод трох кандыдатаў першага сьпіску, прадстаўленага п. п. Прэзэсамі Найвышэйшага Суда, не знайшлося такога, які-б спадабаўся яшчэ вышэйшай, чым Найвышэйшы Суд, уладзе... Дык яна, відаць, папросту вярнула „сьпісак“ — для „пераробкі“... І паны з Найвышэйшага Суду на гэта неяк згадзіліся, прадставіўшы... другі сьпісак... На гэты раз Найвышэйшыя Судзьдзі Польскай Рэспублікі ўжо нейкім трафам—„адгадалі“, хто павінен быць у сьпіску... Усё гэта было-б зусім добра—з боку „супрацоўніцтва“ ўсіх канстытуцыйна падзеленых уладаў у Рэспубліцы,—каб толькі было згодна з Канстытуцыяй, якая, апроч супрацоўніцтва паасобных уладаў, заканадаўчай, выканаўчай і судовай—дае ім дый вымагае катэгарычна цаніць ды пільнаваць так званую разьдзельнасьць ды незалежнасьць гэтых адна ад адной, асабліва-ж судовай улады... Канстытуцыя не прызнае над судовай уладай нічога вышэйшага над ёй, асабліва-ж над Найвышэйшым Судом... А вось самі паны найвышэйшыя судзьдзі неяк зракліся гэтай сваей „рэгаліі“, прызнаўшы над Найвышэйшым Трубуналам нешта — яшчэ вышэйшае... Але можа „Публіц. Агенц.“ кажа няпраўду?

Чысьціня і выбары.

Вачавідкі ў сувязі з выбарамі, каб не дражніць сялянства супроць адміністрацыі і ўраду, мін. Славой-Складковскі, як паведамляе „Аген. Всход“, выдаў загад, каб паблажліва адносіліся да вескі. Міністр рэкомэндуе адлажыць да красавіка г. з. да канца выбараў выкананьне на вёсцы санітарных вымог, як напрыклад: будова сьметнікаў, парадкаваньне гноішч і вясковых вуліц і г. д. Адначасна прыказаў устрымаць накладаньне адміністрацыйных караў да красавіка за непарадкі ў адміністрацыйнай галіне. Хоць на час выбараў звольніцца магчыма наша вёска ад паводкі ўсялякіх адміністрацыйных кар, якія яе ўпрост залiваюць. Хоць гэткая карысьць з выбараў і то добра.

Беластоцкая Хадэцыя за ўрадам Пілсудскага.

Згодна з пастановай усіх польскіх партыяў іцьці на выбарах на „Крэсах Веходніх“ агульльным фронтам, Беластоцкая Хадэцыя вынесла на сваім зьезьдзе вотум даверра да палітыкі Пілсудскага і вотум недаверра Ц. К. за якокую апавіцыю да ўраду.

Няўдачы Эндэцыі.

Існуючае 50 гадоў у Львове „Słowo Polskie“—адзіны орган эндэцыі ў цэлай Усходняй Галіччыне прадаены групе санацыйных абшарнікаў на чале з графамі Дзедушыцкім і Галуховскім. Гэткім чынам эндэцыя засталася без свайго органу ў Усходняй Галіччыне. Гэтая вестка выклікала запраўдную сэнсацыю ў палітычных і прэсавых колах. Галоўны ж орган эндэцыі „Rzeczpospolita“ рашучым чынам пярэчыць гэтым весткам. У кожным выпадку гэта зусім праўдападобна, бо як на ўсіх „Крэсах Усходніх“ гэтак сама і ў Галіччыне ўсе польскія буржуазныя партыі пойдуць разам.

Алесь Салагуб.

Начныя думы.

Цені ад кратаў кладуцца
На процілежнай сьцяне...
Штосьці ня сьпіцца ўсё мне.
Крылатыя думкі нясуцца,
Шыбаюць, вірацъ, імкнуцца
І вабяць кудысьці мяне!
Куды? І па што сярод ночы,
Як стаенныя коні бягуць?
Асабістага шчасьця мо' вочы
Пракладаюць між дроту шлях—путь?!
Прэч ілюзыі, прэч недарэчнасьць!
І ў крыві апалосканы сьцяг!
Для агульнага шчасьця, для сьвету,
Скіраваў я коняў сваіх бег,
Пазайздросьціў няшчасьцям паэта,
Што жыве не для ўласных уцех.
Мо' за славай бягу, што блiснула
Мішурай сярод белага дня? —
— Ня ў той бок! ня туды! узлынула
Сьветлавокая думка мая!
Не па роскаш брыльянтаў, саетаў
Лятуценьні свае скіраваў.
Не для славы мінутнае, сьвету
Мой спакой, волю, шчасьце аддаў

. . . .

Маё шчасьце—у шчасьці мільёнаў.
Мая воля ў вольнасьці ўсіх.
Калі сэрцы заскачуць без стогнаў
У зіяньні агнёў залатых.

Лукішкі 19-VI 1927 г.

Алеся Ц.

Сем раз.

Сем раз адмер, а раз адрэж,
Сем раз абмый, а потым еш,
Сем раз абдумай, раз зрабі,
Сем раз паслухай, раз скажы, —

Але як робіш—за табою
Каб людзі правіць не маглі,
Кажы, што—сэрца ды з душою
Тваімі струнамі былі.

А—ч.

За краты...

Белых сьняжынак пуховыя посьцілкі,
Што зіхацяць так прынадна, багата,
Яснага сонца прамень разьвітальны
Шлю вам за краты.
У сьнежных віхрах ночы бязсьветнае
Неяк пачула я кліч заўзяты,
Сьмелыя крыкі, пратэсты... і гэта
Шлю вам за краты.
Гімны магутныя шчасьця і долі
Ізноў азвуцца у хуткае сьвята...
Нашай зімы беларускай вітаньне
Шлю вам за краты.

Я. Боська.

Дзяўчынка.

Дзяўчынка, каханка, галубка мая,
Як нудна, як сумна мне жыць бяз цябе!
Ня бачу я вочак—праменсак тваіх,
І ўсё мне пастыла, ўсё нудна бяз іх.
Як успомню мінўшчыны мілае час,
Як ночка скрывала няраз адных нас
У цені галінак ад вока людзей,
А месячык песьціў нас там, як дзяцей!..
Бывала к грудзям тваім моцна прыльну
І ціха шапчу: „Ах, цябе я люблю“:
Ты скажаш: „ўзаемна кахаю цябе“
І моцна дасі пацалунак ты мне.
Так доўга прыльнуўшы друг к другу сядзім,
На месяц, на зоркі з табою глядзім.
Гаворкі і сьмеху ў нас поўна з табой,
Табой я натхнёны, натхнёна ты мной.
Цяпер—ты далёка жывеш ад мяне,
А я—тут сумую адзін, без цябе!
Усё мне пастыла, ня хочыцца жыць —
Няма маей мілай, каго-ж бо любіць?

Алесь Салагуб.

Пацалункі вясны.

Мне сьняцца яшчэ пацалункі вясны,
Юнацкай вясны сьветла-крылай,
Вясновыя ночы, чароўныя сны,
Пяшчоты каханай дзяўчыны.
Вясна маладая ў грудзёх маладых
Закінула зьвіч Прамэтэя
І зарава зьяньнем зарніц залатых
Жаўрэе каханьне надзея!
Вясёлкай крыштальнай сьмяецца вясна.
У грудзёх маіх ранак, — сьвітаньне.
Прасторай і воляю жыўлюся я
Агульна-людзкога каханьня.

Мне сьняцца яшчэ пацалункі вясны,
Вясны сінявокай, прастора,
Вясёлкі агністай — чароўныя сны
Бяз жальбы, сьлязы і дакора.

Лукішкі 15 VI 1927 г.

Алесь Салагуб.

На прагулцы.

Сьветла! Блакіт! Вышыня!
З-за муру рагоча прастор.
І ў блеску вясновага дня
Клык выставіў дрот-частакол.
Каб прамень хоць штучнага сьмеху
На тварах мог нашых блiснуць,
На градачцы кветкі цьвітуць
Для вязьняў, вачом па па-цёмку.
Наўкола грады нібы гусі
Нагамі ўздымаючы пыл
Гутарым аб снох, Беларусі,
Аб краю дзядоўскіх магіл.
Гручаць на дарожцы калодкі,
Бьюць рэхам у сьцяну галасы.
У паветры гульлівым салодкім
Мы чуем усьмешку красы.
Весела! Сэрца надзейна стучыць!
Расхрыстаны грудзі, а твар
Зьбялелы на сонца глядзіць
І ловіць касуляў загар...
Жалеза са скрыгам зьвініць...
Цэгла, цэмэнт, бляха, сталь
Ад вока скавалі нам даль...
Купаецца вока глыбока
Там, дзе разьліты блакіт,
Далёка, далёка, далёка...

Зьезд асаднікаў у Варшаве.

У Варшаве ў апошніх днях адбыўся зьезд асаднікаў, на які зьявілася аж 700 дэлегатаў, — усе—з нашых ды ўкраінскіх „усходніх крэсаў". Зьезд, пэўне-ж мае беспасрэднюю сувязь з выбарамі... На асаднікаў польскія партыі і ўрад, як высьветлілася асабліва ў зьвязку з зьездам, асабліва горача вітаным амаль ня ўсёй польскай прэсай, укладаюць вялікія выбарныя надзеі. Разумеюць гэта і асаднікі. Дзеля таго, ясна-ж, гутарка ідзе пераважна аб—новых крэдытах на „падтрыманьне польскага жывёлу на крэсах", на „гаспадарчую культуру" асаднікаў на „крэсах" і г. д. Паны міністры адзін па адным зьяўляліся на асадніцкі зьезд, каб заявіць, што дзяржаўны скарб (чытай: народныя, у значнай частцы і беларускія ды ўкраінскія мазольныя сялянскія грошы!)—адчынены для каханых асаднікаў.

Блёк Нацыянальных меншасьцяў.

16.XII закончыў свае перагаворы ды таргі аб мандацікох блёк нац. меншасьцяў.

У выніку гэтага паведамлена генэральнага выбарнага Камісара аб утварэньні Цэнтральнага Выбарнага Камітэту блёку нац. меншасьцяў.

Выбарная хроніка.

Канфіската адозвы „УНДО".

Украінскае Нацыянальна-Дэмакратычнае Аб'яднаньне („УНДО") выпусьціла прадвыбарную адозву, зараз-жа канфіскаваную уладай. Адозва, як пішуць газэты („УТРО"), называе выбары—барацьбой за ўкраінскі характэр Галіччыны ды—за душу ўкраінскага насяленьня краю. Адозва заклікае да стойкасьці ў гэтай барацьбе, скіраванай процi польскай шляхты на „крэсах", дый—усялякіх іншых прышлых чужынцаў. У канцы адозва заклікае ўсіх украінцаў да стварэньня — адзінага нацыянальнага фронту, каб гэтым забясьпечыць перамогу ўсяго блёку меншасьцяў.

Канфіската „Работніка".

20.XII. сканфіскаваны нумар „Работніка" за артыкул „Капітуляцыя перад абшарнікамі", абгаварываючы эканамічную палітыку ўраду. Як бачым, „свабода слова" ў дэмакратычнай Рэчыпаспалітай пачынае даваць сябе ў знакі навет Работніку.

Маршалак Сэнату Тромпчынскі падаў на ўрад скаргу.

Марш. Сэнату Тромпчынскі падаў у Найвышэйшы Адміністратыўны Трыбунал скаргу на ўрад у справе пазбаўленьня членаў прэзыдыумаў Сойму і Сэнату права бясплатнага праезда на чыгунках на час выбараў. Справу вядуць б. сэнатар Бялявскі і б. пасол Лібэрман. Найвышэйшы Трыбунал маніцца разабраць гэтую справу ў працягу найбліжэйшых тыдняў. Цікава, наскольні хопіць „самастойнасьці" і „незалежнасьці" ў судзьдзяў.

Устава аб судох.

Міністэрства справядлівасьці ўнясло ў прэзыдыум рады міністраў пратэст закона аб уніфікацыі судоў. Устава гэтая ліквідуе застаўшыяся асаблівасьці ў судавядзеньні ўва ўсіх трох заборах, аб'ядныўваючы іх у вадно. Праект будзе разгледжаны на адным з бліжэйшых паседжаньняў рады міністраў.

Барацьба за рынкі збыту для польскага вугальля.

Польскія прамыслоўцы зьвярнуліся да ўраду з просьбай аб урадовай апецы і помачы для экспорта вугальля на паўночныя рынкі (Нарвэгія, Швэцыя, Данія, Фінляндыя, Эстонія, Латвія). Гэта просьба выклікана абніжэньнем цэн вугальля на гэтых рынках, дзякуючы англійскай канкурэнцыі. Адным словам урад з падаткаў мае забясьпечыць даходы польскіх вугальных баронаў.

Пляны польскіх вугле-баронаў гэтым не канчаюцца. Яны зьбіраюцца завесьці ўласную таргевую флёту для дастаўкі вугля ў.... Англію і Ірляндыю. Колькі-ж народных грошы будзе каштаваць гэты замысел, аб гэтым тым часам маўчаньне.

Таргeвы баланс Польшчы за лістапад.

Таргeвы баланс Польшчы ўсьцяж заключаецца з недахопам — ужо каторы месяц. Лістапад ізноў даў дэфіцыт у 38 мільёнаў злотых зьлішкам. У параўнаньні з кастрычнікам—значнае пагоршаньне: увоз павялічыўся, а вываз зьменшыўся,—кожны на 4 зьлішкам мільёны. Зразумела, што гэта—некарысна для Краю. Стабілізаваўшы польскую валюту, замежныя капіталісты патрэбавалі за гэта ад Польшчы — адчыніць шырэй свае граніцы для міжнародавага таварнага абмену... Дык цяпер для Польшчы нястрашны спадак яе валюты, але патым гаспадарчы стан краю ўсьцяж выклікае некарысныя для яго рэзультаты таварнага абмену з заграніцай. Ці доўга можа трываць такі стан усьцяж дэфіцытнай краёвай гаспадаркі, — пытаньне...

Зьменшэньне працэнтаў ад пазыкаў.

Польскі ўрад выдаў 26 загад, які забараняе браць за пазычаныя грошы наагул больш, як 12 працэнтаў у год. Папярэдняе распараджэньне ўраду дазваляла браць 16 прац. Але-ж ведама ўсім, што ліхвяры дзяруць—удвая, утрая, калі яшчэ ня больш.

Калі і дзе пачнуцца польска-літоўскія перагаворы.

Газэты пішуць, быццам польска-літоўскія перагаворы маюць распачацца 10—12 студзеня. Мейсца перагавораў яшчэ ня выбраны: можа — Рыга, можа Талін, можа Дынабург, а можа... Рым?.. Дык чаму-ж — ня Крым...

Заграніцай.

Літоўская апазіцыя —цьвярдзей Вальдэмараса.

Апошнія нумары газэтаў літоўскай апазіцыі рашуча заяўляюць, што фактычнае ўрэгуляваньне добрых адносінаў з Польшчай зрабіцца магчымым толькі пасьля таго, як Польшча ўрэгулюе з Літвой справу Вільні...

Пасьля „Жэнэвы" ў Коўні.

З наваротам Вальдэмараса ў Коўню быццам адразу скончылася „патрыятычная згода партыяў", якая існавала ў часе яго падарожжы ды „барацьбы за літоўскую справу", — каб не перашкаджаць гэтай працы прэм'ера ў Жэнэве. Цяпер ізноў расчараваная апазіцыя ўзьняла вострую барацьбу проці гвалтаўніка-дыктатара.

Вальдэмарас, як толькі прыехаў, зараз-жа „скантраляваў" вернасьць аддапай яму арміі. Аднак-жа, як пішуць з Коўны, чуецца, ня гледзячы на „перамогу" ў Жэнэве, вельмі трывожна.

Сэнсацыйныя плёткі нямецкай прэсы.

Нямецкая правая прэса піша паміж іншым, што ў Жэнэве курсавала „плётка", быццам Пілсудскі, едучы ў Жэнэву па асабістаму запрашэньню Чэмбэрлена, быў пэўны, што Англія і Францыя „дазволяць" яму зрабіць „дэмакратычны парадак" у Літве, сьпіхнуўшы Вальдэмараса... Аж тымчасам Чэмбэрлен рашуча ўспраціўіўся так далёка ідучым жаданьням Пілсудскага... Дык Пілсудскі адразу расчараваўся ў Радзе, што выразіў у вострай форме сваей „ультыматыўнай" прамове на паседжаньні 10 сьнежня.

Акцыя літоўскай сацыял-дэмакратыі проці Вальдэмараса.

Абвешчаная нелегальнай — побач з камунізмам і пашоўшая ў падпольле, літоўская сацыял-дэмакратыя ўсьцяж вядзе зацятую барацьбу з фашызмам у Літве. Пасьля Жэнэвы яна выпусьціла вострую адозву, у якой кажа, што жэнэўскае паражэньне Вальдэмараса павінна быць „пачаткам канца яго панаваньня".

Залагоджаньне італьянска-францускіх адносінаў.

У апошні час — пад уплывам „гутарак дыпляматаў у Жэнэве — неяк залагодзіліся адносіны паміж Італіяй і Францыяй, якія дагэтуль пагражалі папросту аружным канфліктам. Як ведама, беспасрэдняй прычынай завастрэньня дрэнных адносінаў, маючых свае глыбейшыя прычыны, зьявілася цясьнейшае збліжэньне Францыі з Югаславіяй, скіраванае проці імкненьня Італіі да панаваньня на Балканах — шляхам захвату Альбаніі.

Лоўкая палітыка Брыяна, які, відаць, патраціў перакацаць Англію, каб неяк паўстрымала „прыткасьць" Мусоліні, а таксама зрабіў некалькі ветлівых ды карысных уступак Італіі ў другарадных справах, настроілі Мусоліні, які толькі-што зусім ня крыў сваіх пагрозаў у бок Францыі, — больш лагодна. Асабліва прыемна было для павадыра фашызму зачыненьне францускім урадам парыжскага баявога органу італьянскіх эмігрантаў, які—ведама-ж, прычыняў сваей лаянкай ды рэвэляцыямі шмат няпрыемнасьці Мусоліні.

Дык у сваей апошняй прамове на радзе міністраў Мусоліні пасьля ветлівых кампліментаў у бок Брыяна, заявіў, што — „было-б вельмі магчыма ды карысна заключэньне трывалага сардэчнага, абапертага на шырокіх падставах, паразуменьня з Францыяй". Праўда, ён дадаў, што гэта паразуменьне,— „каб быць запраўды трывалым, павінна быць карысным (перадусім для Італіі), не апіраючыся толькі на „літэратурных пачуцьцёвых матывах". „Трэба перадусім — рашуча адсунуць з дарогі ўсё тое, што можа выклікаць канфлікт паміж абодвума краямі". Далей Мусоліні глуха кажа, што ў хуткім часе ён высуне канкрэтныя дамаганьні ад Францыі— „у справах, якія — ня вельмі важныя, але вельмі дражлівыя"... Італія ня мае залішне сьпяшыць з трактатам з Францыяй, але перадусім—дабіцца, каб ён быў „канкрэтны ды карысны". „Надзеі апошніх часоў, кончыў Мусоліні, даказалі, што Італія не падлягае нічыім уплывам, калі рэч ідзе аб яе жыцьцёвыя інтарэсы"... Яены намёк — на захват Альбаніі...

Завастрэньне канфлікту паміж Вэнгрыяй і Румыніяй.

У зьвязку з пагромамі вэнгерскага насяленьня румынскімі студэнтамі на „заходніх крэсах" Румыніі, адрэзаных ад Вэнгрыі Трыянонскім („міравым") трактатам, страшэнна завастрыліся дыпляматычныя стасункі абедзьвюх дзяржаваў.

Вэнгерскі парлямант паставіў на чаргу дня справу румынскіх пагромаў дый вынес аднагалосна вострую рэзалюцыю пратэсту, пагразіўшы скаргай у Лігу Народаў, дамагаючыся перагляду вэнгерска-румынскіх граніцаў... Румынская прэса зарэагавала на гэта страшэнным чыста „балканскім" лаем, характэрна ды ў сваім родзе „слушна" адмаўляючы вэнгерскаму ўраду, які—„сам арганізуе пагромы, фальшуе грошы чужаземных дзяржаваў, таляруе ўсялякі палітычны бандытызм" і г. д., — права закідаць „культурнай заходняй („раманскай") дзяржаве тое, што — „некалькі студэнтаў разьбілі ў вэнгерскіх крамках некалькі вокнаў"... „Дый з прычыны гэтых пабітых вокнаў вэнгерскі парлямант узьнімае справу перагляду трактатаў".

Урадавы крызіс у Фінляндыі.

Не зьліквідаваны ўрадавы крызіс і ў трэцяй балтыцкай дзяржаве — Фінляндыі. Прэзыдэнт даручыў тварэньне новага ўраду—павадыру „аграрнай партыі" Суніолу.

Астаецца адна толькі Літва, за якой цяпер чарод...

Забастоўкі ў Амэрыканскіх Штатах.

Амэрыка заўсёды лічыцца краем, дзе „пануе сацыяльны мір", дзе няма ніякага сацыялізму, ані „ніякага работніцкага", дзе „шляхотныя ды ахвярныя капіталісты прамыслоўцы" самі даюць добра ўзгадаваным, ветлівым і пакорным работнікам усё, што ім патрэбна — бяз ніякай нейкай там „клясавай барацьбы", так шкоднай для абодвух бакоў...

Статыстыка работніцкіх забастовак за апошнія 10 гадоў, нядаўна апублікаваная „міжнародавым Бюро Працы", забівае на сьмерць думку аб гэтай сьмешнай ды недарэчнай „ідыліі", быццам пануючай у найсільнейшай „цытадэлі" сусьветнага капіталізму. Можа і не заўсёды пад сьцягам сацыялізму, ці якой іншай партыі, але клясавая барацьба работнікаў за свае правы і інтарэсы проці жываеда—буржуазіі ўсьцяж, без перадыху ідзе, як і ішла ў Амэрыцы, як і ўсюды інш, дзе толькі спатыкаюцца гэтыя два адвечныя супраціўнікі: гаспадар-працадаўца і работнік. Кожны крок на шляху палепшаньня свайго жыцьця прыходзілася амэрыканскаму работніку здабываць з бою, адным з спосабаў якога зьяўляецца, як ведама, забастоўка.

За 12 гадоў агульная лічба забастовак даходзіць да 28.000... Усяго баставала за гэты час—14 мільён. работнікаў. Усяго стратаў, выкліканых забастоўкамі, з свайго боку выклікаными апорам жорсткіх жываедаў-прамыслоўцаў, дайшлі да 14 мільярдаў дал. 34,5 прац. усяго ліку забастовак закончылася поўнай перамогай работнікаў: каля таго-ж—перамогай працадаўцаў; рэшта забастовак—каля 31 прац. — скончылася кампрамісам (узаемнымі ўступкамі).

Найвялікшая лічба забастовак адбылася ў часе Вялікай вайны—1914-1919 г.г. Пасьля вайны лічба забастовак рэзка зьмяншаецца: У 1919 г.—3630, у 1926—больш, як у тры разы менш—1035... У гэтым—адна з сацыяльных прыяваў нячуванага ўздыму гаспадарчага разьвіцьця і дабрабыту Амэрыкі.

Паўстаньне ў дзяржавах Паўдзённай Амэрыкі.

У правінцыі Мальто Гроссо ў Бразыліі выбухнула паўстаньне. На чале яго стаў нейкі афіцэр, якому падпарадкавалася значная частка правінцыі.

У двох вялікшых партовых местах Калумбіі ўспыхнула паўстаньне. У часе барацьбы вельмі пашкадаваны месты. Высланая проці паўстанцаў артылерыя ўрадавых войскаў перайшла на бок паўстаньня, якое дагэтуль не зьліквідавана.

Змаганьне ССРР з Англіяй у Афганістане.

У Афганістане, які зьяўляецца краем, ляжучым паміж Сярэдня-Азіяцкімі валадзеньнямі ССРР і англійскай Індыяй, зьяўляючыся гэткім чынам брамай для Радавай арміі ў Індыю, ідзе ўжо некалькі дзесяткаў гадоў зацятае дыпляматычнае дый усялякае іншае змаганьне паміж яго магутнымі суседзямі. Гэтае змаганьне асабліва завастрылася цяпер, калі страшэнна завастрылася барацьба—не на жыцьцё, але на сьмерць — паміж гэтымі чаловымі павадырамі вялізарных сусьветных арміяў працы і капіталу.

Радавы ўрад мае ўсе „форы" перад англійскім—бо мае вялізарную перавагу ваеннай сілы ды апору ў працоўных масах краю; Англія, ну, ведама-ж, Англія мае перавагу— тым, што можа заўсёды перакупіць жарлівых усходніх князькоў, кінуўшы ім, скольні тыя толькі запросяць, маючы, апрача таго, апору ў буржуазных і фэадальна-уласьніцкіх элемэнтах краю.

Змаганьне асабліва загарэлася цяпер, калі Англія пачала ў Кітаі рашучы наступ на ўплывы там ССРР—абвясьціўшы ім „вайну на зьніштажэньне"... Радавы ўрад распачаў вострую „дывэрсію" ў Афганістане.

Ці праўда, ці не, але англійская агенства кінула вестку аб тым, быццам афганскі эмір мае зрабіць візыту да англійскага віцэкараля Індыі, а пасьля навет — паехаць у Эўропу, пэўне-ж перадусім у Лёндан... „Англійскія афіцыяльныя колы прыдаюць вялікае значэньне гэтай падарожы". Можа і паедзе. Бо-ж афганскі эмір пакуль-што, чакаючы на „рашучы мамэнт" (калі можа ён сам зробіць — з своімі англійскімі дарадцамі —

. . . .

Скончана.. У камэры хутка
Гоняць з прагулкі. Ідзём...
Прарвалася шчасьця мінутка,
З салодкім рассталіся сном.
Грукаць па драбіне калодкі,
Ляскоча запор і замок.
Прарваўся міг шчасьця салодкі,
Прыроднай красы зьнік куток.
І сэрца хвалююць ўспаміны
Раскошы, каханьня, красы,
І вочы пралескі — дзяўчыны,
Наранку зьвяк звонкай касы.

. . . .

Досыць! Даволі! Даволі!
Мінулага шчасьця ня жаль,
Я шчасьліў тады, калі воляй
Напоўніцца родны нам край.

Лукішкі 18-VI 1927 г.

Хв. Ільяшэвіч.

*
* *

Дрэвы шапочуць у боскай драмоце...
Зорка гарыць, зачапіўшысь ў галінах...
Пар лёгкаўздымны кадзіць на балоце...
Таюць ў начы ціхасьцеўныя гімны...
Гэта малітвы к прастору-сусьвету
У нежным вясеньнім зямлі прабуджэньні,
Быццам... крылатыя казкі-прыветы,
Быццам цудоўныя сьпевы-тамленьні...
Слухай... Маўчы...

*
* *

Творчая, небная сінь сьмяецца ў вясеньніх
калужах...
Люба! Прывольна! Сэрца чуваць ў серабры
дэлікатнага сьмеху...
Думак няма, а вясеньні, сьвяточны настрой
з васількоў...
Хваля людзкая вось, вось захлынецца, зальлецца ў сіні...
Шчыра цалуецца сонца з вулічным, таючым
сьнегам...
У лесе ўжо пэўне праглянулі сінявокія першыя
краскі,
Пэўне ўжо й жаўранак звонка над полем
вітае вясну...

*
* *

Веснавістая рань. Яшчэ росы блішчаць,
Дрэмле ціха ля рэчкі чарот
І сіняй імглою спавітая гаць...
Ледзь чуваць, як зьвіняць тоні вод...
Тс...
З-за далі няўхопнае поля палос
Сонца ўсходзе, нясьмела вітаецца...
Міг—і тысячы брызг асьляпляючых кос
Льлецца хваля сьвятла, разгараецца,
Ахапляе прастор...
. . . .
У лузе косы пяюць. У адказ сінява
Шле касцом пацалункі далёкія,
А ў калосьсях, бязьмежных жытох—любата!
Васількі.... васількі.... сінявокія....

Алеся Ц.

Багаславенны.

(*насьледаваньні*).

Багаславенны, што сеюць краскі
Сярод змаганьня, грому пляскі
І шчыра дбаюць аб чыстым суменьні...
Багаславенны! Багаславенны!
Багаславенны, што ў прышласьць верацъ,
Што ў шчасьцьці зоркі надзею мыраць,
Хоць гінуць ў смутках і зьдзеку цемры...
Багаславенны! Багаславенны!
Багаславенны, што ў аб'яднаньні
Да сьвету рвуцца сэрцам, душамі,
Хоць мо' ў агонь йдуць, пад град каменны.
Багаславенны! Багаславенны!
Багаславенны, хоць лёс іх душыць
І боль за грудзі—сэрца бярэ
(Як-бы агонь іх пякельны душыць,
Як бы каршун іх клюе, дзярэ)
Хоць зьгінуць у страшным надта „вяньзеньні".
Багаславенны! Багаславенны!

Алеся Ц.

Тэстамэнт.

Мілы Сябра, я ўміраю, адтаго, што быў
праўдзівы,
Роднаму жадаў што Краю, каб быў вольны
і шчасьлівы;
Што хацеў, каб сонца шчасьця роўна людзям
ўсім сьвяціла,
Каб працоўнаму народу
Дзьверы ўсюды адчыніла;
Што змагаючыся са зьдзекам паняволеных
мільёнаў...
Нёс ім раду, нес ім лекаў — Вызваленьне з
мукаў, стогнаў...
Мілы Сябра! Я ўміраю, ды з спакойнаю
душой
І цябе багаслаўляю—йдзі дарогаю маёй...
Йдзі абдумана, адважна:
Мэта блізка ўжо—дапнеш
І настане хвіля важна—у бой мільённы
павядзеш,
. . . .
Той мільённаю рукой —
І ўжо вечна зорка шчасьцьця
Будзе зьяць над усей зямлёй.

М. Т—н.

СУХАРЫ.

(Абразок з інтэрнацкага жыцьця).

„Добры дзень! Дарагая мамачка! Нам тут надта кепска жывецца. Есьці мала даюць, усё кажуць, што адправяць дамоў. Усе вучні такія галодныя, што ходзяць і шукаюць, каб дзе скарыначку чорнага хлеба. Мне самаму таксама надта есьці хочацца. Ня ведаю, што будзе! Дарагая мамачка, калі можаш, то хоць трошкі там нек зьбяры ды прышлі хоць чорных сухароў. Надта ўжо хочацца. Праўда, ты калісь мне казала, што калі будзеш галодны, то і кніжка ў горла не палезе. І сапраўды неяк, калі жывот падцягнула, той вучыцца ня хочацца, хоць вучыцялі кожны сабе цягне, кожны крычыць, каб вучыліся. Дык мамачка прышліце, хоць колькі можаце. Ваш сын Сьцёпка".

Напісаўшы гэтыя радкі, Сьцёпка старанна, з нейкай любасьцю злажыў у чатыры разы і ўлажыў у канвэрт, на якой крывымі літарамі вывёў адрас.

„падарожжу“—значна далейшую, як Эўропу...) пакуль-што — папросту бярэ з абодвух бакоў—англійскага і радавага — усё, што здолее ўзяць.

Радавы „наглядчык“ пры Лізе Нацыяў.

Швайцарская прэса даносіць, быццам у часе апошняга зьезду дыплёматаў у Жэнэве, у тым ліку і прадстаўнікаў ССРР, быў высунуты і абгавораны праект стварэньня становішча „наглядчыка“ ССРР пры Лізе Нацыяў.

Чычэрын едзе на Захад.

У студзені 1928 г. Чычэрын быццам мае выехаць на курацыю ў Ніццу. Праездам мае заехаць у Варшаву, дзе будзе гутарыць з мін. Залескім. Так даносіць з Масквы карэспанд. „Кур. Варш.“.

Выключэньне раду павадыроў апазіцыі з Кам. Партыі.

Радавыя газэты даняcьлі аб пастанове XV кангрэсу Камун. Партыі, вялізарнай большасьцю галасоў выключыўшага з партыі цэлы рад найвыдатнейшых павадыроў апазіцыі. Выключаны — Каменеў, Евдокімаў, Пятакоў, Радэк, Ракоўскі, Смілга, Сафараў, Смірноў, Сапронаў і шмат іншых.

Зараз жа пасьля пастановы—гэтая група апазіцыянераў, у лічбе найвыдатнейшых з іх, на чале з Зіноўевым і Каменевым, зьвярнулася да кангрэсу з заявай аб адрачэньні ад апазіцыі і з просьбай — прыняць назад у партыю. Кангрэс даў адказ адмоўны.

Новы лёзунг III Інтэрнацыяналу.

„ПАТ“ даносіць, што на апошнім пасэджаньні III Інтэрнацыяналу („Комінтэрна“) Бухарын сказаў прамову, у якой высьветліў новы лёзунг, кінуты Комінтэрнам камуністычным партыям Англіі, Францыі, Нямеччыны Польшчы, якім трэба кіравацца—у агітацыі на прышлых выбарах у парляманты. Камуністычны Інтэрнацыянал выбраў цяпер выбарным быццам лёзунгам не „барацьбу за мір“, як гэта было нядаўна, але — абарону ССРР, як адзінай дзяржавы працоўных у сьвеце. Раскрываючы зьмест гэтага новага лёзунгу працоўных, Бухарын высьветліў, што павадыром камуністычных партыяў розных краёў трэба прапагаваць—не „паражэнства“, не „пацыфізм“ (барацьбу за мір“), але—пераход на бок чырвонай арміі—у часе ўзьнікшайся вайны, — каб прымаць чыннае ўчасьце ў барацьбе ССРР з яго ворагамі — імпэрыялістамі. Далей Бухарын паведаміў, што Комінтэрн апрацаваў у духу гэтага новага лёзунгу дакладныя інструкцыі для заграмічных партыйных дзеячоў. Дзеля таго, што гэты лёзунг спаткаў ужо вялікія спрацівы з боку сацыял-дэмакратыі розных краёў, дык на набліжаючыхся выбарах трэба распачаць рашучую, бязумоўную барацьбу з сацыял-дэмакратамі. Лёзунгам гэтай апошняй барацьбы будзе — „супольны фронт камуністаў з работніцкімі масамі, арганізаванымі ў сацыялістычныя партыі“. Новы абраны лёзунг у барацьбе з сацыял-дэмакратыяй, з другога боку па славах Бухарына будзе вельмі карысны—бо-ж сымпатыі да Радавай Расеі сярод работнікаў усіх краёў — вялікія. Гэтым шляхам работнікі найлепш пазнаюцца на сацыялістах, якія тэарытычна і практычна зьвязаны з камуністычным ладам, а дзеля таго і — проці-радавым фронтам імпэрыялістычнай буржуазіі. Каб найляпей ваяваць з сацыялізмам, трэба атакаваць іх галоўныя пазіцыі, гэта значыць—прафэсіянальныя саюзы. У гэтым кірунку Профінтэрн (камуністычны інтэрнацыянал прафсаюзаў) прыме шэраг патрэбных мераў.

Зразумела, што, зьвяртаючыся —цераз галовы павадыроў сацыялізму — беспасрэдна да арганізаваных ім работніцкіх масаў, недарэчна прапанаваць „супольны фронт“ самім кіраўніком сац. партыяў.

БРАТЫ! НЕ ЗНІШТАЖАЙЦЕ СВАЕ БЕЛАРУСКАЕ ГАЗЭТЫ; ПРАЧЫТАУШЫ, АДДАЙЦЕ СУСЕДЗЯМ.

„Гістарычны крок“ ці новая „унія“—вясельле беларускага Ягеллы з польскай Ядвігай

Да Зьезду „Краёвага Народнага Саюзу“ ў Вільні).

Няўжо-ж вы нічога ня ведаеце?—Нічога—аб тым, што сталася ў Вільні 27 лістапада у салі, поўнай яшчэ слаўнымі традыцыямі валэйшаўскага „Грамадзянскага Сабраньня“, ці—менш гучна „беларуска-паляпафільскай шулерні“?.. Калі не, дык ведайце, што вы—і нічога ня ведаеце аб тым, як творыцца гісторыя Беларусі, як куецца яе доля воля, як рыхтуецца яе слаўная „незалежная будучыня“...

Каротка кажучы, 27 лістапада ў Вільні зроблены—„Гістарычны крок“.

27 лістапада ў Вільні—„стварыўся Краёвы Народны Саюз Літоўска-Беларускіх Земляў“... Калі хто хаця крыху ведае гісторыю ды разумее сучаснае палітычнае жыцьцё, дык зразумее, што гэты „краёвы народны саюз“ ёсьць найпэўнейшай падставай адраджэньня нашага Літоўска-Беларускага Гаспадарства, якога слаўная мінуўшчына зьяўляецца найлепшай заставай нямення пекнай будучыні...

Але—ведама-ж—гісторыя ў нашыя часы ідзе страшэнна шпаркім ходам,—дык—каб прысьпяшыць гэтую будучыню—у час паўстаньня з мёртвых Літоўска - Беларускае Дзяржавы—зараз жа адбылася і унія гэтай „незалежнай“ дзяржавы з Польшчай.

Дык—няўжо-ж—нічога ня чулі аб гэтым?—Не?—Так слухайце-ж, што піша аб усім гэтым „Беларускі Дзень“:

„Яшчэ ў соботу вечарам“, як быццам нічога ня было...—Але—ужо пачала рыхтавацца да адраджэньня Літоўска-Беларуская Дзяржава, тварыцца „Народны Саюз“... — „Пачалі з'яжджацца ў Вільню „самахоць“ дэлегаты з розных куткоў краю, пераважна „сяляне“... (!) Прыехаў „з далёкага кутка краю“—нікому запраўды ж дагэтуль няведамы „селянін“—адвакат Рачкевіч (блізкі сваяк п. Віленскага Ваяводы?..) Прыцягнуўся неяк з далёкай пушчы — на II Партовай — другі „селянін“—адвакат Абрамовіч, „стары краёвец і дэмакрат“... Прыпёр з сваей ціхай глушы і „сярмяжны селянін“—рэдактар „Беларускага Дня“, стары Пранук Умястоўскі, кінуўшы для народнай справы панскія бровары ды казённыя манапольныя крамкі...

Падыйшло й яшчэ шмат „сялян“ — літоўскіх ды беларускіх: ведамы Цяўлоўскі з Наваградчыны, (аб якім Паўлюкевіч кабрахаў, быццам ён служыць у дэфэнзыве!), цяпер ужо даволі знаёмы, — Тарыкаў, Зянюк, Адамовіч, за якімі—у цёмным кутку—хавалася і „новая зорка“ „літоўска беларускага дзяржаўнага адраджэньня“ над Польшчай—Міхайла Гурын, той самы, што будзе — галоўным „сьведкай“ з боку пракурора на працэсе Грамады...

Зьехаліся ў Вільню і прадстаўнікі польскай радыкальнай думкі—„былыя вызваленцы“ і „былыя сябры Сялянскай Партыі“ і „Саюзу Дробных Земляробаў“, як былы пасол Гэльман, былы фэльчар ці цырульнік, (ласы на каапэратыўны мядок, як цьвердзіць гр. Обст) і інш.

Адным словам,—у суботу паднеч—усё неяк—само сабой уладжылася, ці было падрыхтавана—да станоўчага гістарычнага кроку, які і быў зроблены ў нядзелю.

Але, прыбыўшы ў Вільню, усе гэтыя паасобныя творчыя элемэнты новай Літоўска Беларускай дзяржаўнасьці — з „быўшых польскіх людзей“, ня ведаючы адзін аб адным, неяк сьпярша пабіліся на тры групы.— Адна—былыя польскія вызваленцы і былыя сябры польскага „Сялянскага Саюзу“ (былыя — бо ж выключаныя навет уласнымі партыямі...) сабраліся ў салі Крэйнгеля; другая—„беларускія радыкалы“ з былым польскім акцызьнікам на чале-чакала, ня ведаючы, што рабіць, у рэдакцыі „Беларускага Дня“—на Ціхай вул.; трэція — гэльманаўскі „Саюз Хлебаробаў“, ці пары-махэраў, нараджалася на Нікадэмскай вуліцы, — да каго прыстаць, каб таксама здабыць пару мандатаў...

І вось, тады пачаў працаваць сам Лёс ці Геній літоўска беларускай гісторыі, які атрымаў—ну, ці хто ня ведае адкуль? — даручэньне Аб'яднаць усе гэтыя групы ў адзіны „Народы Саюз“.

Як піша „Беларускі Дзень“, — „па прапазіцыі гр. Рачкевіча“ (старшыні зьезду ў салі Крэйнгеля), былі пасланы дзьве „дэлегацыі: адна з іх пакіравалася на Ціхую вуліцу“ да беларускіх „радыкалаў“ гр. Умястоўскага, а другая на Нікадэмскую — да „дробных земляробаў“ п. Гэльмана.

„Прапазіцыя гр. Рачкевіча“ падзеяла проста цудоўна!—Праз якія пяў гадзіны „беларускія народныя радыкалы“ маркі Умястоўскага-Гурына, прынясшы сьпешна гатовую ўжо „рэзалюцыю аб уступленьні ў Агульны Народны Саюз“, пачалі „гістарычна крачыць“ на Людвісарскую!!“

Тое-ж самае зрабілі і „літоўскія дробныя хлебаробы“ Гэльмана.

Такім чынам—у 1 гадзіне беларускія і „літоўскія“ ручаі пачалі ўжо... „зьлівацца ў польскім моры“...

Апісаньне гэтай „гістарычнай хвіліны“—адно з найлепшых дасягненьняў мастацка-казённага пяра „Беларускага Дня“ гр. Умястоўскага!...

Як толькі „беларускія радыкалы“ ўвайшлі ў салю, „прысутныя на салі (палякі — былі вызваленцы ды б. „сельсаюзьнікі, сярмяжныя адвакаты, дый усялякія іншыя дэмакраты ды краеўцы) спаткалі ўваходзячую Беларусь—з „Беларускага Дня“ воплескамі і крыкамі: „Няхай жыве Беларускі Народ“...

„Беларускі народ“ — у адказ на гэтыя прывітаньні—ўзьнёс кліч: „Няхай жыве братэрства народаў“, падхоплены ўсей Зямлей, выбачайце пакуль што — саляй, ды пакрыты магутным (расейскім) „Ура“...

Сярод „краёўцаў“ з салі Крэйнгеля знайшоўся навет адзін, ведаючы беларускую мову, які — „выразіў сваю радасьць з таго, што ў радох краёвага народнага Саюзу будуць (!!) беларусы, якія складаюць найбольшы працэнт жыхарства літоўска-беларускіх земляў“...

У адказ на гэта гр. Умястоўскі і Цяўлоўскі ў польскай (ведама-ж братарскай) мове, аб чым скромна ня піша „Бел. Дзень“... у гарачых прамовах заклікалі ўсіх „сялян“ адвакатаў ды ўрадоўцаў... да лучнасьці...

Калі-ж падыйшлі яшчэ і „дробныя хлебаробы“ з Гэльманам на чале, тады — саля і ўсе сэрцы ў ёй—польскія, беларускія і „літоўскія“ перапоўніліся да краёў „шчырым і праўдзівым энтузыязмам“... „Усе сяляне беларуска-літоўскіх зямель злучыліся ў аддну сямью“!.. „Гістарычны крок“ быў зроблены!..

Аставалася толькі „аформіць“ справу. Быў выбраны старшынёй нова-створанай „злучанай сям'і“ „стары краёвец“ адв. Абрамовіч. У сваей прамове гэты былы „прэм'ер“ ужо адзін раз „адроджанага“ „Літоўска-Беларускага Гаспадарства“ — у відзе „Літвы Сродковай“ генерала Жэлігоўскага,—граміў страшэнна „беларускіх шавіністаў“, якія зрабілі тое, чаго ня здолелі зрабіць навет царскі маскоўскі ўрад ды нямецкія акупанты: пасварылі родных братоў—беларусаў з палякамі!.. Гэтыя „беларускія шавіністы штучна прышчапілі (беларускім і літоўскім) масам ненавісьць“, а да якой—пэўне-ж ня было ніякай падставы—бо ж—„не павінна быць розьніцы паміж паляком, беларусам і літвіном“... „Кожныя маюць права на асьвету і школу ў роднай мове“. А „беларускія шавіністы“... пазбавілі беларускія масы гэтых правоў!. „Досьць ужо ўціску над беларусамі“!.. А беларускія „шавіністы“ ўсьцяж душаць беларусаў...

„Апошнія словы пакрыты былі гучнымі воплескамі“. Аратар-краёвец пекна казаў далей: „Перад вайной ня было ніякіх нацыянальных спрэчак у краі. „Былі толькі сыны аднэй зямлі“ — польскі магнат-абшарнік кахаў, як брата, беззямельніка-батрака—беларуса... Польскі адвакат у Вільні сумленна бараніў правы таго, хто меў чым заплаціць за „справу“... І вось—„сягодня адраджаецца ізноў тое, што было! Сягодня вялікае сьвята злучэньня! Сягодня спраўджаюцца вялікія словы Ігнэя Каліноўскага: „вольныя з вольнымі, роўныя з роўнымі“!!

І вось, тут—перад вачымі „ўсіх беларуска-літоўскіх зямель“ наступае найдраматычнейшы, найбольш расчуляючы ды ўзрушаючы мамэнт усяго гістарычнага здарэньня, адбыўшага ў былой валэйшаўскай „шулерні“.

„У знак братэрскай лучнасьці—польскага народу з беларускім — гр. Абрамовіч палуецца з гр. Умястоўскім“, „найвыразьней выяўляючы гэтым сымбалічную мінуту братэрства“ і злучэньня... Цяпер, ужо, выбачайце — пасьля таго, як пацалаваліся „самі народы польскі і беларускі“ — у асобах іх бясспрэчных, шчырых, магутных паўнамоцных прадстаўнікоў — грам. Умястоўскага і грам. Абрамовіча — ніякая сіла ворагаў абодвух народаў ня здолее разлучыць таго, што злучана на небе самім Богам, а на зямлі,—кожны лёгка зразумее сам,—кім ды чым...

Пасьля гэтай урачыстай „гістарычнай хвіліны“—пачалася—„дзелавая праца“—якая, коратка кажучы, мае скромнай мэтай — здабыцьцё беларускіх мандатаў у часе выбарнай кампаніі для братэрскі злучыўшыхся... сяброў польскага „Шляхоцкага Клюбу“ ў Вільні, да якога, як ведама, належаць здаўна—як грам. Умястоўскі таксама і грам. Абрамовіч, Рачкевіч і інш...

У заключэньне — яшчэ пару цытатаў з саго-ж „гістарычнага“ нумару „Бел. Дня“, скуль мы ўзялі апісаньне „гістарычнага дня“ 27 га лістапада г. г.

Пекны артыкул „Дзень пераломy“ дае выражэньне, відаць, таму „народнаму энтузіязму і радасьці“, якія ахапілі ўсе „літоўска беларускія землі“ — бачыўшыя на свае вочы, як „сымбалічна“ цалаваліся гр. Абрамовіч з гр. Умястоўскім, як — „заручыліся“, так сказаць, новыя польская Ядвіга з беларускім Ягеллам — на падрыхтаваным добра гр. Валэйшай грунцье салі Крэйнгеля...

Дык вось паслухайце, як пекна пяе аб гэтай „гістарычнай мінуце“ казённы салавей у „Бел. Дні“, як мілагучна скрыпіць там казённае пяро у —чэсьць зьезду, лучнасьці ды „сымбалічных пацалункаў“...

„Як прамень сонца, гэтыя мінуты асьвятляюць... увесь далейшы шлях, цярністы шлях жыцьця“... Людзі, ведаеце, — „шукаюць праўды“... „І калі гэтая праўда знойдзена, чалавек, ці цэлы народ, — як-бы нараджаецца другі раз на сьвет“...

І вось — якраз у „пераломны“ дзень 27 лістапада, шукаючы праўды, беларускі народ, — „знайшоў гэтую праўду“ — у салі Крэнгеля, пабачыўшы, як... грам. Абрамовіч цалуецца з грам. Умястоўскім, — у асобах якіх — уся земляробская сярмяжная рэць наша — (ваша, ваша пане бутэрбродзе)... падала друг другу рукі“...

„Гэта была адна толькі хвіля, толькі адзін момант гістарычнага зьезду, але гэтая хвіля, як прамень горачы, нрабіла і каменныя сэрцы, растапіўшы лёд іх“...

„Бурная радасьць прарвалася, як прарываецца вясной вада праз крыгі, і захапіла сабой нашага гаротнага, змучанага селяніна“... Дык — „Няма ўжо сягоньня больш ні беларуса — бо-ж і ня было ані воднага на зьезьдзе ня было, дык няма)... ці паляка, літвіна“... „Замест іх усіх — ёсьць браты, ёсьць сыны роднага краю“... Ёсьць—сябры адзінага польскага шляхоцкага клюбу — вул. Міцкевіча 19—сабраўшыхся, каб пацалавацца „сымбалічна“ — дзеля супольнай акцыі — „пад літоўска-беларускім сьцягам“ — дзеля паляваньня за мандатамі, — у салі-б былога „Беларускага Клюбу“ гр. Валэйшы — Людвісарская 4...

„Гора таму, хто не разумее і не адчувае гэтае хвілі пераломy“, пагражае адзін з „малайцоў“ рэакцыі „Бел. Дня“... Вось, гэта — дык праўда: гора тым, хто будзе перашкаджаць паном з „Краёвага Народнага Саюзу“ адурваць выбаршчыкаў — беларускіх сялян, перашкаджаць ім — лавіць неўлавімыя для іх беларускія мандаты...

Чаму гора,—гэта лёгка зразумее кожны.

Прысутны.

„Няхай йдзе“, падумаў, „можа што й прышле. От, калі прышле. Тца!“—чмокнуў губамі і патрос радасна галавою.

Цэлы гэты дзень Сьцёпка думаў: як гэта матка атрымае пісульку, як прачытае, насушыць сухароў і прышле, а ён іх тут атрымае. Вось ужо пад'есьць! Кожны раз будзе браць па кавалачку да гарбаты на сьнеданьне і вячэру. Гэтыя лятуценьні трымаліся цэлы дзень, з імі ён клаўся спаць, з імі і ўставаў.

II.

Аўдоцьця—матка Сьцёпкі — найбяднейшая ў вёсцы ўдава, сядзела ў сваёй хаце і прала. Лучына трашчала і крывава-чырвоным сьветам напаўняла хату. Чорная і няпрытульная была яна, але весела затое было на сэрцы ў Аўдоцьці. Яе адзіны сыночак вучыцца, выходзіць у людзі! Што за шчасьце, што за пацеха!

Яна думала і думала. Прад вачыма прабягалі вобразы свайго дзіцяці, свайго даражэнькага Сьцёпкі! Яна забывалася аб працы і верацяно падала з грукам на падлогу. Яна замірала ў сваіх думках...

Тымчасам дзьверы адчыніліся і ўвайшоў Арцём—сьвядомы селянін з гэтай-жа вёскі.

— Добры вечар у хату!

Аўдоцьця ўстрапянулася.

— Добры вечар, добры вечар! Сядайце!

— Дзе тут сядзіцца, трэба дадому ісьці. Вось у гміне быў ды пісьмо ад твайго сына прынёс. На вось, чытай!

— Пісьмо?! Ад майго Сьцёпкі?! Давайце-ж хутчэй!

— На! Нацешся!

— Але! Сапраўды ад яго! Пазнаю яго руку.

І пісулька пачала скакаць у рукох узрадаванае жанчыны. Ня ведала, як радавацца: то хавала яго за пазуху, то ізноў выймала і глядзела праз яго на сьвет ад лучыны.

— Ды кінь ты ўжо ім цешыцца! Давай весь ляпей прачытаю, што ён піша!

Сеўшы ля стала, Арцём падзёр канвэрт і дастаў пісульку. Аўдоцьця падняла сьвятляк і з нецярплівасьцю сачыла за суседам.

— Чытай-жа хутчэй! — напрасіла з сьлязьмі радасьці на вачох.

— Добры дзень! Дарагая мамачка! — пачаў Арцём... Але тут маці не сьцярпела і залілася сьлязьмі. Доўга з ёй вадзіўся дзядзька, пакуль угаварыў праслухаць пісьмо. А калі ўжо ўсё прачытаў, маці яшчэ больш зараўла.

— Чаго табе плакаць? Ну й размазалася, паглядзі ты яе?!

— Добра та-а-бе казаць! Сынок га-аладае, а ён, чаго ты пла-а-ачаш! — гікаючы прагаварыла Аўдоцьця.

— Дык што плачам паможаш? Насушы вось сухароў, дый пашлі, то й ня будзе галадаць!

— Ведаеш,—ужо трохі спакайней сказала Аўдоцьця — што няма чаго сушыць! Сама ледзь-ледзь жыву!

— Ну, ты ўжо гэтага не кажы! Заўтра я пайду па вёсцы ды зьбяру па гарцу, а ты сьпячэш ды насушыш. А цяпер бывай здарова!—і налажыўшы на галаву шапку выйшаў. Аўдоцьця крыху пасядзела і, схаваўшы за абразы пісьмо, пачала прасьці.

На другі дзень дзядзька Арцём прынёс пуды са два мукі, дроў і Аўдоцьця рашчыніла хлеб, а пасьля заўтра ўжо добрую пачку сухароў здалі на пошту.

III.

Сьцёпка сядзеў у клясе. Уважна, з цэлым сэрцам слухаў ён, што казала яму вучыцелька беларускае мовы. Раптам расчыняюцца дзьверы клясы і яго клічуць.

„Грошы!“, „Пасылка!“ — пранясьлося па клясе.

У сапраўды—на калідоры Сьцёпка пабачыў начтальёна, які чакаў з вялікім пакункам. Ледзь занёс яе ён у сваю шафку.

Калі скончыліся лекцыі і вучні сабраліся ў інтэрнаце, дык толькі і гутарка была аб сьцёпчынай пасылцы. Шафку яго абкружылі яго сябры, кожны хацеў хоць адрабінку атрымаць.

— Дай мне! І мне і мне!—разьлягалася наўкола і толькі рэха адбівалася ад голых сьцен, калі галодныя хлапцы грызьлі чорныя сухарыкі.

Аднак Сьцёпка ўсяго не раздаў: Дзе-ж ты ўсіх накорміш?

IV.

Дзевяць гадзін увечары. Сьцёпка, каб хутчэй дачакацца раніцы і смачна пад'есьці сухароў з гарбаткаю, лёг спаць і даўно ўжо смачна хроп.

На калідоры;—дзе заўсёды вучылі лекцыі, сядзела яшчэ з дваццаць хлапцоў, закапаўшыся ў кнігі ды сшыткі. Ціхі шум данасіўся ад іхняй грамады.

— Хлопцы! Хто хоча сухароў?

Гэтыя словы, як токам электрычнымі пранізалі ўсіх. Хто дзе сядзеў, пісаў ці чытаў, як віхор ляцеў туды, адкуль данёсься гэты гук. Мурам акружылі таго хлапца, які крыкнуў і які стаяў каля Сьцёпчынай шафк..

— Вось! Сёньня атрымаў?

— Ну?

— Давайце, дастанем па сухарыку!

— Што тут гаварыць? Давайце ключы?

Хутка адамкнулі, пахваталі сухары, так што толькі крышкі засталіся ў мяшэчку.

— Калі галодны—то чалавек як зьвер! Ці ня праўда?

— Ведама! — адказалі, хрумкаючыя вусны.

. . . .

Назаўтра Сьцёпка хацеў дастаць сухароў да гарбаты, але... адчыніўшы шафку, вытарашчыў толькі сьлязьлівыя вочы...

З Таварыства Беларускае Школы.

Да валасных і гарадзкіх самаўрадаў.

Галоўная Управа Т-ва Беларускае Школы, маючы на мэце распашырэньне беларускае асьветы і культуры сярод насяленьня Заходняе Беларусі, зварочваецца гэтым да валасных і гарадзкіх самаўрадаў з заклікам і просьбаю аб унясеньні ў бюджэт на 1928 год сталай дапамогі на культурна-асьветную дзеяльнасьць Таварыства Беларускае Школы, з тым, каб у распараджэньне Галоўнае Управы была высыгнавана штомесячная сталая дапамога ў тым разьмеры, у якім знойдзе магчымым валасная ці гарадзкая Рада. Да вызначэньня-ж сталае дапамогі Галоўная Управа просіць валасную ці гарадзкую Раду прыйсьці на помач ёй безадкладна высыгнаваць у першую чаргу на бліжэйшыя патрэбы Таварыства аднаразовую дапамогу для Галоўнай Управы Т-ва Беларускае Школы.

Галоўная Управа Таварыства Беларускае Школы пры гэтым зазначае, што патрэбы Таварыства Беларускае Школы ў матэр'яльных срэдствах у цяперашні час зьяўляюцца нязвычайна пякучымі. Цяпер, калі беларускае насяленьне мае нацыянальную сьвядомасьць, якая выражаецца ў імкненьні яго да сваей роднай школы, кніжкі і мовы, узрасла патрэба тварыць гэтую школу, выдаваць кніжкі, адчыняць бібліатэкі-чытальні, чытаць газэты, гадаваць у беларускіх школах у роднай мове будучых інтэлігентаў, змагароў за лепшую будучыню сваей Бацькаўшчыны. У Беларускіх Гімназіях вучыцца соткі дзяцей бяднейшых сялян і работнікаў Заходняе Беларусі, якія пры ўсім жаданьні ня ў сілах самастойна ўтрымліваць сябе і дзеля гэтага выбываюць з гімназіяў, недавучыўшыся і ўвеўшы ў страты бацькоў. Таксама і іскаваньне беларускіх гімназіяў, пазбаўленых дзяржаўнай помачы, надзвычай цяжкое: гімназіі месьцяцца ў халодных, цесных і сырых будынках, вучыцялі працуюць у прогаладзь; аб палепшаньні-ж іх уласнымі сіламі няма й мовы. Для падтрыманьня сваіх культурна-асьветных установў, як ў цэнтры так і на правінцыі, для разьвіцьця беларускае асьветнае працы патрэбны матэр'яльныя срэдствы, якія можа даць на свою-ж карысьць сам беларускі народ, для якога гэтыя культурныя ўстановы існуюць і вядзецца праца.

Галоўная Управа ведае цяжкі матэр'яльны стан беларускае вёскі, зрабаванай страшнай вайной, але нашай справе можа памагчы толькі гэтая вёска і дзеля гэтага Галоўная Управа ўсё-ж такі зварочваецца да гэтых вёсак, у іх валасныя Рады з гарачым заклікам падтрымаць сваю родную культуру, бо ў ёй і толькі ў ёй залог нашай лепшай будучыні.

Грамадзяне Радныя, помніце, што адмаўляючы ў дапамозе Т-ву Беларускае Школы, Вы сваімі уласнымі рукамі нішчыце родную культуру і мову.

Грамадзяне Радныя, памятайце, што на Вашым абавязку ляжаць, ня толькі клопаты аб матэр'яльным стане Вашых выбаршчыкаў, але і дбаць аб яго душы, патрэбы якой найбольш разумееце Вы, выбраныя да працы ў самаўрады з тых-жа самых вёсак. Галоўная Управа верыць, што выбраныя сыны нашага народу зразумеюць важнасьць справы і скарыстаюць з правоў самаўрадаў апякавацца над сваім народам і прычыняцца да палепшаньня дабрабыту краю, які бяз культурнай працы самага народу доўгія часы яшчэ будзе пакутаваць у цемры.

Галоўная Управа Т-ва Бел. Школы.

Ахвяры незаможным школьнікам.

Солтыс у м. Далятычи Міхал Хацяновіч сабраў на карысьць незаможных вучняў ахвяры ў суме 9 зл.

Варта было-б усім нашым солтысам узяць гэтую працу грам. Міхала Хацяновіча за прыклад, за што бедныя вучні не асталіся б бяз удзячнасьці.

Гурток Т-ва Беларускае Школы ў вёсцы Сенькавічы Косаўскага павету, перасылаючы сабраныя ахвяры ў суме 12 зл. 45 гр., заклікае ўсе гурткі ўзяцца за збор ахвяр для нашых будучых змагароў за лепшую долю працоўнага люду.

Вучні Астрынскае пачатковае Школы, складаючы сваю пасільную ахвяру ў суме 5 зл., пішуць наступнае:

„Даведаўшыся аб цяжкім матэрыяльным становішчы Віленскае Беларускае Гімназіі, мы, вучні Астрынскае пачатковае школы, пастанавілі прыйсьці з дапамогай, склаўшы пасільную ахвяру. Школа—гэта кузьня, дзе куецца лепшая наша будучыня. (Далей ідзе сьпіс ахвярадаўцаў, які рэдакцыя газэты за бракам месца зьмясьціць ня можа).

Галоўная Управа Т-ва Белар. Школы, складаючы шчырую падзяку ахвярадаўцам за ахвяры, з задаваленьнем адзначае высокі ровень грамадзкай сьвядомасьці сярод вучняў Астрынскае школы, якія аддаюць свае апошнія грошы на грамадзкую справу. Чэсьць Вам, дарагія дзеткі! Хай-жа ваша ахвярнасьць паслужыць прыкладам і для дарослых грамадзян. Тады наша старонка будзе пэўна, што беларуская асьвета сярод працоўнага люду, ня гледзячы на ўсе перашкоды, разьліецца шырокай ракой па ўсей нашай Бацькаўшчыне.

Гал. Упр. Т-ва Бел. Шк.

Грамадзяне гор. Беластоку прыслалі 12 зл. 70 гр.

Жуховіцкі гурток Т-ва Белар. Школы Стаўпецкага пав. 4 зл.

Аронэвіцкі гурток 2 зл.

За ўсе гэтыя ахвяры Галоўная Управа Т-ва Б. Ш. прыносіць шчырае дзякуй і шле сяброўскае прывітаньне.

Праца гурткоў Т-ва Беларускае Школы.

Гурток у в. Урачы Слонімскага павету наладзіў наступныя спэктаклі вечарыны: 14/X г. г. ў в. Урачы; гулялі „Пан Міністар". 30/X г. г. ў той жа вёсцы гулялі „Мікітаў Лапаць" і „Чорт і Баба". 17/XI г. г. гулялі ў в. Акупінава „Пан Міністар", „Чорт і Баба" і „Мікітаў Лапаць". Спэктаклі захаплівалі глядзельнікаў і воплескам ня было канца.

Гурток складае ўсім, хто прышоў з дапамогай пры ладжаньні спэктакляў, шчырую падзяку.

Блізьнянскім гуртком Косаўскага пав. за 1927 г. пастаўлены былі наступныя п'есы: 1) Янка Канцавы, 2) Боты, 3) Модны Шляхцюк, 4) Зьбянтэжаны Саўка, 5) Конскі Партрэт, 6) У Кавалёвай Хаце, 7) Атрута, 8) Пасланец, 9) Страхі Жыцьця, 10) Гурток, 11) Лекары і Лекі. Даход пашоў на карысьць бібліятэкі-чытальні пры гуртку.

Да працы Таварыства Беларускае Школы.

Галоўная Управа Т-ва Беларускае Школы цыркулярам зьвярнулася да Акружных Управаў і гурткоў Т-ва з заклікам ладзіць у Калядныя Сьвяты вечарыны са спэктаклямі, ёлкамі, дэклямацыяй, сьпевамі і чытаньнем рэфэратаў, даход ад якіх пайшоў-бы і на культурна-асьветныя і дабрачынныя мэты. На выручаныя грошы Галоўная Управа заклікае выдаваць кніжкі, каб напоўніць бібліятэкі-чытальні Т-ва.

Адначасна Галоўная Управа прапануе ніжэйпададзены сьпіс п'есаў для спэктакляў і вершы да дэклямацыі. Асаблівая ўвага зьвяртаецца на ладжаньне ёлак у сьвяты са сьпевамі і дэклямацыяй, што можа быць зроблена і у звычайнай хаце.

Для дзіцячых спэктакляў можна скарыстаць толькі-што вышаўшую з друку п'ску „Ёлка Дзеда Мароза".

П'есы, якія надаюцца для пастаноўкі і якія цэнзураваны:

I. Камісарам Ураду м. Вільні 2. XI. 1926 г. № 47259: „Зьбянтэжаны Саўка" — жарт у 1 ак., „Пасланец"—жарт у 1 ак., „Конскі партрэт"—жарт у 1 ак.,—Л. Родзевіча (у адным зборніку, ц. 60 гр.), „Заручыны Паўлінкі" — абразок у 1 ак. з песьнямі і скокамі — Ф. Аляхновіча, ц. 35 гр.; „Янка Канцавы"—вясковая драма ў 5 акт. К. Сваяка, ц. 50 гр.; „Сурдут і сярмяга"—драм. абразкі з песьнямі і скокамі ў 3 акт. У. Гутоўскага, ц. 70 гр.; „Выбары Старшыні"—(друкаваная лацінікаю), вясковая трагі-камэдыя ў 3-х акт. Я. Быліны, ц. 40 гр.; „Птушка шчасьця"—у 3-х акт. са сьпевамі і скокамі Ф. Аляхновіча, ц. 40 гр.; „У іншым шчасьці няшчасьце схавана"—1 акт. К. Каганца, ц. 20 гр.; „Дрыгва" (раней „Манька") — драма ў 6 абразох, Ф. Аляхновіча. ц. 1 зл. 50 гр.; „Васількі"—др. з сучаснага жыцьця ў 5 акт. А. Паўловіча, цана. 50 гр.

II. Камісарам ураду м. Вільні 27. VIII. 1927 г. № 5203: „Атрута"—жалобны абр. у 1 ак., М. Гарэцкага, ц. 30 гр.; „Боты" — водэвіль з песьнямі і скокамі ў 1 ак., перакл. з украінскага; „Мікітаў лапаць" — кам. у 2 акт., М. Кудзелькі, „Пакой у наймы"—жарт у 1 ак. Паўлоўскага, „Чорт і баба" — жарт ў 1 ак.. Ф. Аляхновіча (4 п'есы ў адным зборніку ц. 1 зл. 20 г.); „Дахапаліся"—абразок з нядаўнай мінуўшчыны ў 1 ак., А. Васілеўскага, ц. 30 гр., „Жанімства па Радіо" (друк. лацінікай)—п'еса ў 3-х акт. Ст. Грыневіча, ц. 50 гр.; „Лекары і лекі" (друк. лацінкаю)—камэдыя ў 1 ак. А. Гаротнага, ц. 30 гр.; „Ня розумам сьцяміў, а сэрцам"—п'еса з вясковага жыцьця ў 4 акт. К. Вясёлага, ц. 50 гр., „Страхі жыцьця"—драма ў 3-х акт., Ф. Аляхновіча, ц. 50 гр., „Суд над трохпалёўкай"—агро-п'еса ў 1 ак. Уліціна, ц. 40 гр.

III. Камісарам Ураду м. Вільні 26. I. 1926 г. № 3239: „Шчасьлівы муж"—камэдыя ў 4 ак. Фр. Аляхновіча, ц. 50 гр.

IV. Камісарам Ураду м. Вільні 7. XII. 1927 г. № 7378/V: „У зімовы вечар"—сцэна з сялянскага жыцьця Э. Ожэшко, ц. 50 гр.

V. Міністрам Унутраных Спраў: „Паўлінка"—сцэны з шляхоцкага жыцьця ў 2-х акт. Фр. Аляхновіча, ц. 70 гр. сцэнзур. 20. VII. 1927 г. № Дз. IV. АА. 4743/Pa/27; 1937 дз. к.; „Апошняе спатканьне" — драма ў 4-х акт. Ул. Галубка, ц. 40 гр.—сцэнз. 14. III. 1925 г. № Дз. 2494 BC/1486 дз. к.; „Модны шляхцюк"—жарт у 1 дзеі, сцэнзур. 13. VI. 1925 г. № Дз. 5322. BC. 25/1527 дз. к.

Для дзіцячага спэктаклю: „Ёлка Дзеда Мароза"—п'еска ў 3-х абразох — Маладога Дзядка, ц. 35 гр.

УВАГА: Сцэнзураваны і хутка выйдуць з друку: „Пашыліся ў дурні" і „Па рэвізіі"—пераклад з украінскае мовы, „Модны шляхцюк" і іншыя.

§ 6. Для дэклямацыі: вершы і расказы, якія можна знайсьці ў паказаных тут кнігах: *„Воўк і авечка", „Дурны мужык як варона", „Здарэньне", „З кірмашу", „Бог ня роўна дзеле", „Дзе чорт ня можа, — там бабу пашле" — верш. у зборн. „Дудка Беларуская", М. Бурачка, цана 60 гр. Вершы: *„Пястун", *„І плач не паможа", „Пакі" і інш. у зборн. „Снапок", А. Паўловіча, ц. 50 гр.; расказы: „Хлеб", „Пазыка", „Заморскі зьвер", „З маленькім білецікам", *„Вучоны бык" і інш. у зборн. „Бярозка", Ядвігіна Ш., цана 90 гр.; вершы: *„Люблю наш край", „У бяссонную ноч", „Я шукала"... і інш. у зборн. „Курганная кветка" — К. Буйло — ц. 1 зл. 50 гр., вершы: „На ніве", „Тройка", „Покліч", „Дзядзька ў Вільні", „Асадзі назад" і інш. у зборн. „Выбраныя творы", Я. Коласа, ц. 2 зл. *„Гэй наперад", „У школу", *„Пахаваньне", Песьня, *„Камарова сьмерць", *„Раніца", *„На ніве", у кн. „Родны край", Гарэцкага II ч., ц. 3 зл.; *„Вучыся", *„Доля сіраты", „Маці", *„На службе", (дэкл. у асобах). „Раніца ў нядзельку", „Сымон Музыка", „Над Нёманам", „Слуцкія ткачыхі", „Пагоня", і інш. у кн. „Родны Край", Гарэцкага III і IV ч., ц. 3 зл.; *„Холадна", „Мужык", *„Хто ты гэтакі", „Былі ў бацькі тры сыны", „Ужо днее", „Ворагам беларушчыны", „Чужыне", *„Вучыся", „На Куцьцю" і інш. у зборн. „Шляхам жыцьця" — Я. Купалы, цана 5 зл. 10 гр.; *„Добрыя дзеці"—у „Заранцы" № 1; *„З выраю", *„Дзьве лялькі"—у „Заранцы" № 2—3 ар.; *„Мушка-зелянушка і камарык—насаты тварык" — у „Заранцы" № 3; *„Байка ў асобах" — у „Заранцы" № 5—6; *„Пастушка" — у „Заранцы" № 7. Кожны нумар „Заранкі" каштуе 35 гр.; „Вера беларуса"—верш Цёткі, „Вясковым кабетам" — у Хрыстаматыі Дварчаніна вып. I, ц. 1 зл. 50 гр.; „А хто там ідзе", „Курган", „Цару неба е зямлі" — вершы Я. Купалы. „Пісьмо з турмы" — Я. Коласа — у Хрыстаматыі Дварчаніна вып. II, ц. 2 зл. 50 гр.; „Ты мой брат", „Муляры", вершы Гаруна — у хрыстам. вып. III, цана 1 зл. 50 гр.; „Песьні гарбара", „Сявец", „Я жыць хачу", вершы Ц. Гартнага—у хрыстам. вып. IV, ц. 1 зл. 50 гр.; „Край мой родны—як выкляты Богам", „З песьняў беларускага мужыка" вершы М. Багдановіча, „Мой родны край" в. Фр. Аляхн., — у хрыстам. в. V, ц. 2 зл.; „Мэта жыцьця", „На матыў хаўтурнага маршу", *„Люблю я сонца залатое" і інш. Н. Арсеньневай у зборн. „Пад сінім небам", ц. 2 зл. 50 гр.; „Беларусам", „Жыта", „Гусі" — вершы Я. Коласа — у календары Т-ва Беларускае Школы на 1928 г. цана 1 зл.

Для пяяньня: „Беларускі песеньнік" — Л. Рагоўскага, цана 50 гр.; „Дзіцячы сьпеўнік" — А. Грыневіча, цана 1 зл. 20 гр.

УВАГА: вершы, адзначаныя зоркаю, для дзіцячай дэклямацыі.

Форма заявы аб дазволе на спэктакль.

Таварыства
Белар. Школы
Гурток у в. . .
Дня . . 192 . г,
№ . . .
пошта . . . .

Пану Старасьце . . . . . . пав.

Управа . . . . . . Гуртка Т-ва Белар. Школы ў в. . . . . ., воласьці . . . . . гэтым просіць Вас аб дазвол на вечарыну, якая мае быць зладжана Гуртком „ " студзеня 192 . г. у вёсцы . . . . . воласьці . . . . . у памешканьні грамадзяніна . . . .

Чысты даход ад вечарыны пойдзе на культурна-асьветныя мэты Т-ва Беларускае Школы і на дабрадзейныя, „ " процэнтаў будзе адлічана на карысьць пацярпеўшых ад стыхійных няшчасьцяў:

Пастаўлены будуць: 1. „Заручыны Паўлінкі"—п'еса ў 1 акце Ф. Аляхновіча, у беларускай мове, 2. Ёлка для дзяцей, 3. Прадэклямаваны вершы: „Гэй наперад" — Я. Купалы, „Вучыся"—Я. Коласа. 4. Песьні: „Не пагаснуць зоркі", „Чамуж мне ня пець" і г. д.

Пасьля спэктаклю будуць скокі да 4 гадз. уночы.

Пачатак а 8-ай гадзіне ўвечары. Уваход па платным білетам ад „ " гр. да „ " зл. „ " гр.

Адказная асоба грам. Янка Пятровіч, пражываючы ў в. . . . .

Далучнікі п'еса, 3 вершы для дэклямацыі і 4 песьні.

Старшыня . . . . .

Сэкрэтар . . . .

УВАГІ: Вышэйазначаныя п'есы і кнігі можна выпісваць за гатоўку з беларускае кнігарні ў Вільні—Вострабрамская вул. № 1.

Блянкі друкаваных афішаў таксама можна выпісваць за гатоўку па 5 гр.

Наша хроніка.

„Беларускае Рабоча-Сялянскае Аб'яднаньне". Як мы даведаліся і як паведамляе віленская ўрадовая прэса, у Вільні з'арганізаваўся Цэнтральны Выбарчы Камітэт Беларускага Рабоча-Сялянскага Аб'яднаньня ў складзе: старшыня—Арцём Пекач, сэкрэтар—Янка Бэрыт і скарбнік—Юстын Юхно.

Па запэўненьнях арганізатараў Камітэт пашырае сваю дзеяльнасьць на ўсю Заходнюю Беларусь.

Льготы для праезду буржуазнай моладзі. Як паведамляюць віленскія польскія газэты, на днях павінна выйсьці распараджэньне, што льготы на праезд вучням і студэнтам будуць ня толькі для тых, хто едзе ў III клясе, а таксама і для тых, хто едзе ў II клясе. Не вядома—ці абяднела буржуазія, ці пазавідавала нябогам-беднякам. Але што-ж—свой не заплача, дык скрывіцца.

Вучні Віленскай Беларускай Гімназіі не атрымалі зьніжкі на чыгунцы навет на III кл. Ня гледзячы на тое, што ў Віл Бел. Гімназіі вучацца самыя бедныя дзеці і пераважна з правінцыі — яны і надалей мусяць плаціць поўнасьцяй за праезд на чыгунцы. І гэта крыўда робіцца ім ужо каторы год. 10./XII. дырэкцыя Віл. Бел. Гімназіі зьвярнулася да Куратарыуму і да Дырэкцыі П.К.П. з просьбай даць вучням Віл. Бел. Гімназіі зьніжку, пры паездцы іх да хаты на каляды. Ня гледзячы на ўсе захады Дырэкцыі Гімназіі і Галоўнае Управы Т-ва Бел. Школы, зьніжкі не атрымана.

Цікава, што ў 1922/23 школьным годзе вучні Віл. Бел. Гімназіі карысталіся зьніжкай пры праезьдзе на чыгунцы. Відаць, вецер падуў зноў у другі бок....

Вучнеўскі вечар у Віленскай Беларускай Гімназіі. У суботу 17-га сьнежня быў зладжаны вучнямі 7-ай клясы В. Б. Г. вечар. Пастаўлена былі п'есы Э. Ожэшко „У Зімовы вечар" і „Лекары і лекі" Гаротнага. Абедзьве п'есы прайшлі вельмі жыва. Маладыя артысты ў выпаўненьні сваіх роляў выказалі сябе, як найлепей. Дапоўніў праграму вучнёўскі хор пад кіраўніцтвам. Г. Шырмы добра выкананымі беларускімі песьнямі. Закончыўся вечар скокамі пад гукі гімназіяльнага аркестру.

Трэба адзначыць, што такія вечары, ладжаныя самымі вучнямі паадзінокіх клясаў, вельмі карысны для іх, бо разьвіваюць у іх самастойнасьць у працы. Але з другога боку, як бы добра гэтыя вечары ня былі ладжаны—ўсё-ж яны ня змогуць даць таго, што-б самі вечары, ладжаныя ўсей гімназіяй і пры дапамозе пэдагогаў. Таму можа і лепш было-б, каб вечары ў гімназіі рабілі не паадзінокія клясы, а ўсея гімназія.

Садзяць і апякуюць. 18 сьнежня г.г. ў салі Апэляцыйнага Суду ў Вільні адбыўся Агульны Сход новага Т-ва „Patronat Więzienny", які нібы будзе мець на мэце апеку над вязьнямі.

Пэўна-ж пры гэтым і наплакалі над доляй вязьняў. Вось да чаго дапраўды даходзяць „дабрадзеі". Сэмі-ж садзяць, самі і „апякуюцца". Якраз выглядае, як ў нашага поэты М. Бурачка „Скацінная апека".

Ужо пачалося. Як падаюць газэты, у пав. Віленска-Троцкім распачалася ўсіленая агітацыя здрайцаў працоўнага беларускага народу—вызваленцаў.

У Ландварове паўстаў выбарчы камітэт польскае Партыі Працы.

Як паведамляюць—выехала на правінцыю „галоўная артылерыя паўлюкевічаўскай банды.

Як відно—робіцца весялей. Каб ня кончылася толькі для кагось хаўтурамі. Беларускія працоўныя гушчы, спадзяёмся, як належыць, ацаняюць крамкі з салодкімі цукеркамі, у сярэдзіне якіх—атрута.

Лекцыі па беларусазнаўству ў Варшаве. Як нас паведамляюць, у Варшаве ў г. зв. „Instytucie Wschodnim"—вядомы беларускі археолёг і гісторыяграф інж. Р. Зямкевіч распачаў курс беларускае літэратуры. Апрача таго, гр. Р. Зямкевіч запрошаны для чытаньня курсу беларускай літэратуры ў Варшаўскім Унівэрсытэце.

Вельмі цікава, што ў Варшаве выкладаецца беларуская літэратура, у той час, як у нашым Віленскім Унівэрсытэце, дзе гэта патрэбна, ня гледзячы на дамаганьні беларускага грамадзянства—аб катэдры беларусазнаўства і дасюль нічога ня чутно.

Вось дык дзіўна. У Вільні беларусам „убіваюць" толькі польскасьць, а ў Варшаве—дык і беларусазнаўстве завялі. Ці ня робіцца гэта з мэтай фабрыкацыі „спэцыялістаў" па беларусазнаўству сярод польскіх буржуазных сынкоў, якія маюць заняць пасады ў школах на Зах. Беларусі, якімі відаць хоча „абдарыць" нас „прыхільны" Урад? Як так—трэба неўзабаве спадзявацца наезду новых „галілеюшаў, але ўжо „з вышэйшай беларускай кваліфікацыяй".

Адным словам,—можам зусім цешыцца!

Паехалі у Літву з Польшчы і—з Польшчы ў Літву... Мясцовыя газэты падалі, што ваяводзкія ўлады пачалі выдаваць шырока „пшэпусткі" на пераход польска-літоўскай граніцы. Тое ж робяць і літоўскія ўлады ў Коўні. Падзеяла ўжо паразуменьне ў Жэнэве.

„Камені Вільні гавораць". Пад такім загалоўкам у „Słowie" выкаваецца радасьць з поваду стацьці якогась (бязумоўна-ж „слаўнага") данскага публіцыста Бёмгольма, які напісаў, што ў Вільні кожная будыніна панамінае аб польскасьці Вільні.

Бязумоўна-ж стацьця якогась публіцыста з далёкае Даніі, які пэўна-ж ніколі й ня быў у Вільні (а што ён ня быў — аб гэтым сьведчыць яго цьверджаньне, што ў ваколіцах усюды відзён элемэнт польскі) — для п. п. вучоных з манархічнага „Słowa", зьяўляецца падставай тверджаньня, яўнай маны.

Ці запраўды камені гавораць аб польскасьці Вільні—мы дазволім сабе сумлявацца, але што гаворачыя пэўна-ж галавы п. п. з „Słowa" даўно ўжо акамянелі — ў гэтым сумлявацца ня прыходзіцца.

Цікава, што й „дэмакратычны" „Кур'ер Віленскі", стацьця данскага публіцыста ўзрадавала ў падобны-жа спосаб.

Віленскае Проціўсухотнае Т-ва зьвярнулася да беларускага прадстаўніка ў мейскай Радзе м. Вільні гр. К. Крука з просьбай надрукаваць у беларускай прэсе ніжэйпаданую адозву:

Віленскае Проціўсухотнае Таварыства мае сваім заданьнем барацьбу з сухотамі сярод усіх слаёў насяленьня м. Вільні. Віленскае Проціўсухотнае Таварыства, у поўным сэньсе ўстанова грамадзкая, ня мае ніякага імкненьня да нажывы; яно стаіць на груньце аполітычным, мае жаданьне працаваць з пабуджэньняў ідэёва-лякарскіх на карысьць усяму насяленьню, бяз розьніцы рэлігіі і нацыянальнасьці. Выходзячы з закладу, што сухоты ёсьць хвароба галоўным чынам незаможнай часткі насяленьня, а таксама работніцкай клясы; той часткі насяленьня, варункі быту якой зьяўляецца найгоршымі, В. Пр. Т-ва хоча бачыць сярод сваіх пацыентаў пераважна людзей бедных—тых, якія ня могуць дазволіць сабе на прыватнае лячэньне і таму занядбоўваюць хваробу, або калі кошты лячэньня ад'емна ўплываюць на матэр'яльны стан сям'і, урываючы часамі і без таго вельмі скромную пажыву.

Беднае беларускае насельніцтва м. Вільні, як і незаможнае насельніцтва іншых на-

цыянальнасьцяў пры ўсялякіх выпадках лёгачных хваробаў або пры падазрэньні аб іх без усялякіх засьцеражэньняў можа зьвяртацца да Парадні В. П. Т. (Вільня, вул. Жэлігоўскага, 1—16)—і там знойдзе прыхільнае і людзкае адношаньне да сябе, як таксама фаховую лякарскую дапамогу, якая будзе падавацца праз дактароў-спэцыялістаў па лёгачных хваробах.

Для атрыманьня бясплатных парадаў і лячэньня ў Парадні вымагаецца пасьведчаньне аб незаможнасьці з Гаспадарственнага Бюра Пасярэдніцтва Працы (Р. В. Р. Р.), з гаспадарственных і самаўрадавых установаў, грамадзкіх інстытуцыяў, усіх прафэсіянальных арганізацыяў, або ад вядомых асобаў.

Запісы на прыём адбываюцца ў Парадні ад 2 да 5 гадзін штодня.

Ад імя Віленск. Праціўсухотнага Т-ва
Д-р Бароўскі.

Радны К. Крук ад сябе заклікае беларускае насяленьне м. Вільні ў выпадку хваробы зьвяртацца да В. П. Т., а дзеля пасьведчаньня незаможнасьці проста да яго ад 9—11 раніцы штодня (Вострабрамская — 1, каапэрат. „Spółdzielcza").

Да усіх беларусаў!

Ня кожнаму можа ведама, як цяжка здабыць вышэйшую асьвету сыном нашае беларускае вёскі па прычыне сялянскай нашай беднасьці. Але кожны добра ведае, што беларускае адраджэньне патрабуе шмат інтэлігенцкіх кваліфікаваных сілаў. Сілы гэтыя растуць па меры атрымліваньня нашаю моладзьдзю высокае асьветы, як на Бацькаўшчыне, так і за яе межамі.

Мы — беларуская, студэнцкая моладзь, згуртаваная ў свой Беларускі Студэнцкі Саюз Віленскага Унівэрсытэту імя Стэфана Баторага, ня маючы ніякага падтрыманьня, прабіваем сабе шлях да навукі толькі сваімі ўласнымі сіламі ды ватугамі нашых бедных бацькоў, жыхароў вёскі.

Каб мець магчымасьць утрымаць на гэтым шляху сваіх зусім незаможных калегаў-студэнтаў, якія мусяць дайсьці да пастаўленае перад сабою мэты, сярод нас паўстала думка зьвярнуцца да ўсіх сьвядомых Беларусаў і спачуваючага нам грамадзянства іншай нацыянальнасьці з заклікам прылучыцца да грамадзкага падтрыманьня нас пасільнаю матар'яльнаю падмогаю, якая палегчыць нашае жаданьне ўзброіцца ведаю, так патрэбнаю нам для будучае творчае працы на славу і карысьць Нашага Народу!

Ахвяраваныя падмогі просім перасылаць па адрэсе: Wilno, Białoruski Związek Akademicki ul. Św. Anny № 2.

Старшыня Саюзу (—) Т. Куніцкі.
Сэкрэтар (—) С. Станкевіч.

Ад Рэдакцыі. Свае ўвагі адносна гэтае адозвы Рэдакцыя дазваляе сабе зрабіць у наступным нумары.

КАРЭСПАНДЭНЦЫ.

Культурная праца на вёсцы.

Мы постаць сьветласьці імкненьняў,
Пажар між цемры старых дзён —
Нясем сьвятло для пакаленьняў,
Нясем цямноце мы праклён!

Васілёк.

Магутная хваля адраджэнскага руху, ламаючы на сваім шляху, зьлепленыя з чорнага бруду перашкоды — збудаваныя дзякуючы адвечнай цемры—гору нашаму—збаўчым сьвятаром разьлілася па роднаму краю, ахапіўшы запалам да адраджэнскае працы самыя захалусныя куточкі Беларусі. Трэба ня бачыць, з якой упартасьцю, з якімі вялікімі высілкамі вядзецца праца ў нашай беднай вылазячай з пад адвечнага ярма панаваньня чорнай рэакцыі, вёсцы — каб не адчуваць у душы вялікай асалоды, каб не пакладаць яскае надзеі на гэту жывую творчую сьцяну, вырастаючую што раз вышэй і вышэй з паміж заросшай палын травой — дзікім зельлем роднае мясьціны; сьцяну, якая будуецца магутнай сілай мазолістых рук, закладаючых сталёвы фундамант свае сьветлае лепшае будучыні.

27-га лістапада с. г. Гуртком Т-ва Бел. Школы ў вёсцы Шкленск, Горадзенскага павету, быў наладжаны вечар-спэктакль. Былі згуляны дзьве п'есы: „Міхалка" і „Суд", пасьля чаго пяяліся беларускія песьні, дэклямаваліся вершы беларускіх паэтаў і ўрэшце пад гучныя воплескі сабраўшайся — ня гледзячы на мокрую пагоду — з суседніх вёсак публікі, вечар быў закончаны сваей „Лявоніхай" Увесь даход пайшоў на бібліатэку-чытальню, існуючую пры гуртку.

Ці варта пісаць, якое добрае ўражаньне на глядзельнікаў зрабіў гэты вечар? Колькі не даводзіцца чытаць аб пастаноўках на вёсцы аматарскімі драматычнымі сэкцыямі гуртоў Т-ва Бел. Школы — спэктакляў, усе яны праходзяць надзвычайна добра. Бо сапраўды, наша моладзь, наша надзея, кладучы свае маладыя поўныя творчай энэргіі сілы — змагаюць ўсе перашкоды — (а колькі іх ёсьць!!!) — як то, з клапотамі аб дазволе, езьдзіць па яго да пастарунку мяйсцовай паліцыі, праз якую прыходзіць ён ад п. старасты, ці раз трэба адмерваць дзесяткі вёрст, будаваньне сцэны, пілаваньне дошак на памост і г. д. Гэта-ж, акрамя ўрываньня часу, які дорага каштуе кожнаму сябру нашай культурна-прасьветнай арганізацыі, бо ён траціць дзень часу працы, вынікі якой у віде мізэрнай падзённай заплаты, пакіроўваецца ўсяцэла на барацьбу за свае існаваньне. Пералічыўшы ўсё гэта, ці-ж не становіцца ясным, што той аматар-артыста, каторы выконвае тую ці іншую ролю — кладзе ў яе сваю душу, выкоўвае з сябе тое вялікае зразуменьне для ўсіх, якое гаворыць славамі: „Глядзеце! мы—самы, ня просячы ласкі чужой, мы — цёмныя, спаняверaныя, служыўшыя да гэтага часу толькі зьдзекам для другіх, мы — сваею воляю буйным запалам маладых сілаў, паднімаемся з нізін, маўляў—сакаліная сям'я, і нясем на сваіх крыльлях магутных, сьвет зьніштажэньня цемры, сьвет адраджэньня, падняцьця на адпаведную вышыню свае роднае беларускае культуры, свае мовы і ўсяго роднага, што жывець у нашым сэрцы і што ў лучнасьці з намі творыць нешта вялікае, магутнае, расквітаючае для будучыні яскравым вобліскам шчасьця тваіх працоўных сыноў, Беларусь!

М. Чабор.

Вось дык асьвета.

(Вёска Круты-Бераг, Нясьвіжскага павету).

Некалькі разоў пробавалі мы адчыніць у сябе родную беларускую школу, дзеля чаго складвалі дэклярацыі, падавалі паданьні, але ўсё дарэмна. Гэтая няўдача адняла нам рукі і адабрала ахвоту старацца аб сваей школе. Нам дагэтуль пруць настаўнікаў галічан, пра карысьць якіх нам ня трэба гаварыць. Дзеці ў школе толькі псуюцца ды зусім дарма трацяць час. Так ёсьць і ў гэтым годзе. З восені месяцаў два зусім ня было вучэньня. Настаўнік — кіраўнік то на ўрлёпе, то ў Варшаве, то жэніцца з нейкаю настаўніцаю, як журавель з чапляю, то засьніцца, то засядзіцца ў сваей каханкі, а дзецям надакучыць адным у школе, яны й разьбягуцца. Але прыслалі яшчэ адну настаўніцу, галічанку, каторая быццам сядзіць ў школе й вучыць, ды ад гэтае навукі яшчэ горшая шкода.

Настаўніца зусім не разумее дзяцей, а дзеці яе. Ад злосьці яна сувае дзецям пад нос хвігі. Вось табе й навука, прасьвета й выхаваньне!!! Ды гэта-ж мы, браткі, і за дарэм ня мелі горшае крыўды, горшае абразы. Геткім парадкам у нас псуецца больш 180 дзяцей.

Бацькі, маткі, апякуны! Ніхто, апрача вас, не жадае больш карысьці для вашых дзетак і ніхто вам не паможа. Возьмемся-ж мы ўсе, як адзін, за складаньне новых дэклярацыяў, пакуль ня позна да — 31 сьнеж. с. г. Стукаймо моцна — і нам адчыняць. Мы маем на гэта права! Нас за гэта ў вастрог не пасадзяць. Як мы будзем чакаць нейкае ласкі ад кагось, то нашы дзеці, а з імі і мы будзем бачыць заўсёды хвігу, або яшчэ што й горшае!

Паврыўджаны.

„Прагандляваліся".

(З Пастаўскага павету).

У нашым мястэчку Паставах існуе з 1921 году каапэратыў „Зярно", які арганізаваны на сялянскія грошы.

Спачатку 1921—23 г. г. у каапэратыве лічылася каля 2 тысячаў пайшчыкаў.

Гэты каапэратыў адыгрываў вялікую ролю ў гаспадарчым жыцьці нашага мястэчка і мясцовага жыхарства нашае гміны.

Пастаўскія гандляры былі перапалоханы шпаркім разьвіцьцём каапэратыва; — не дарма адзін з выдатнейшых працаўнікоў каапэратыва сказаў перад сабраньнем сяброў, „што мясцовыя гандляры давалі „лапуўку" ўпраўленьню каапэратыва, каб яны прыпынілі гандаль у каапэратыве".

Адным словам каапэратыў вёў вялікую канкурэнцыю з Пастаўскімі гандлярааі, і адваёвываў крок за крокам шырэйшы шлях у сваім разьвіцьці. Але гэта было спачатку.

З 1924 года каапэратыў стаў хварэць, дзякуючы таму, што ім заўладалі асаднікі.

Тавары першае патрэбы былі даражэй, як у прыватных, а часам прадаваліся нясумленна: падмешвалі ў нафту воду і г. д.

Гэтае зьявішча моцным рэхам адгукнулася на ўсім жыцьці каапэратыву, і грамадамі людзі ішлі выпісвацца з каапэратыву, кажучы, „што каапэратыў у сучасным становішчы — гэта ёсьць нажыва для асаднікаў і іх прыяцеляў".

Вось у 1927 годзе была зроблена рэвізія каапэратыву, у якім ў гэты час быў кіраўніком нейкі Жук; аказваецца, што гэты Жук украў на 300 зл. тавараў. Калі яму на сабраньні каапэратывы сказалі, што гэта подласьць; — то ён Жук адказаў: „на тое гандаль, ці выгандлюеш, ці прагандлюеш".

Апошняе сабраньне каапэратыву выбрала новую рэвізыйную камісію, якой даручана спраўдзіць усе кнігі і вінаватых аддаць пад суд. Але, дзякуючы таму, што на сабраньне прышло амаль якіх 30 чалавек, дык рэвізыйная камісія цалком засталася старая, толькі з дабаўленьнем 2 сяброў.

Пакуль-што ціха з рэвізіяй—мо' і „прагандляваліся".

Моцны.

„Нашы" вучыцелькі.

(В. Сашыцы, з Пружаншчыны)

Вось ужо 6 гадоў, як ў нашае вёсцы адчынілі польскую школу. Вучыцелек было аж 3. Вучылі яны надта добра плясьці ім пляцёнкі пад ногі, потым панчохі, але зусім ня любілі рахункаў. Дык за тое цяпер у нас ёсьць вучыцелька, нейкая Здановіч, дык ей неяк адмовіць, каб яна „рахункі" ня любіла. Гэтаму сьведчыць наступны прыклад:

Аднаму вучню, сыну Сьцяпана Скработа задала адно пытаньне, сэнс якога сама не ўяўляла. Калі-ж вучань не адказаў, дык яна яго так „пагладзіла" па твары, што беднае дзіця страціла прытомнасьць.

Вось, сяляне! Хай гэты прыклад яшчэ раз нам падскажа, што з геткаю навукаю трэба змагацца. Замест калечаньня сваіх дзетак, будзем дружна дамагацца сваей роднае школы усе, як адзін.

Чарот.

Паштовая скрынка.

К. Сьветлавастокаву. Патрэбныя інфармацыі ў свой час дастанеце. Дзякуем за Вашы інфармацыі. Газэту для Вас высылаем, але просім аб падпісцы, на якую Вы забыліся. Вельмі шкода, што Вы належыце да такое бруднае арганізацыі авантурніка Паўлюкевіча, якога трэба гнаць адусюль. — **Васілю Ліпскаму ў Слаўгорадзе.** Карэспандэнцыю Вашу дасталі. Зьмясьціць яе ў сучасны мамэнт ня можам.

Хто чытае нашу газэту і не прысылае падпіскі, той ня спрыяе разьвіцьцю роднай беларускай прэсы.

БРАТЫ! Прысылайце падпісную плату, а хто задоўжыўся, выраўняйце свой доўг.

Рэдактар-Выдавец: А. Выдрыцкі.

Друкарня Я. Левіна. Вільня, Нямецкая 22.